ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

ДЗЕДЗІЧ

Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.
(Янка КУПАЛА)

№ 1(20)
ЛЮТЫ 2003

2 ТРЭЦІ ТЭРМІН: БУДЗЕ ЦІ НЕ? ВЫНІКІ САЦЫЯЛАГІЧНАГА АПЫТАННЯ

6 ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР: ЛЮТЫ – ПАЭЗІЯ СВАБОДЫ

4 МАСЯНЯ: БЫЦЬ АБО НЕ БЫЦЬ?

8 DEPECHE MODE ПА-БЕЛАРУСКУ

# ВЫБАРЧЫ ФАРС,

## АБО ЯК Я Ў ВЫБАРЫ ГУЛЯЎ

ВОСЬ УЖО ХУТКА 10 ГОД, ЯК УСЕ ВЫБАРЧЫЯ КАМПАНІІ, ШТО ПРАХОДЗЯЦЬ У НАШАЙ КРАІНЕ, МОЖНА ЛІЧЫЦЬ ДАРЭМНЫМ МАРНАВАННЕМ ДЗЯРЖАЎНЫХ СРОДКАЎ. І ТАК ВЯДОМА, КАГО АБЯРУЦЬ ПРЭЗІДЭНТАМ; ДАСТАТКОВА ЗІРНУЦЬ НА МЕСЦА ПРАЦЫ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ І ЗРАБІЦЬ БЕСПАМЫЛКОВЫ ПРАГНОЗ, КАГО З ІХ "АБЯРУЦЬ". ХАДЗІЦЬ НА ВЫБАРЫ, КАЛІ ЎЖО ЗАГАДЗЯ ВЯДОМЫ ВЫНІК, КАЛІ ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ ФАРМІРУЮЦЦА ТЫМІ, ХТО РАССТАЎЛЯЕ ПА АКРУГАХ СВАІХ КАНДЫДАТАЎ, – ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ БЕССЭНСОЎНА ГУБЛЯЦЬ СВОЙ ЧАС.

Ведаючы ўсё гэта, маючы немалы досвед удзелу ў выбарчых кампаніях не толькі ў Беларусі, але і за мяжой, я ўсё ж такі вырашыў прыняць удзел у мясцовых выбарах.

«На што ты спадзяваўся? – запытаецеся вы. – Хіба ты забыўся, у якой краіне жывеш?» Не, не забыўся. Але, адчуваючы за плячыма моцную падтрымку сваіх сяброў і паплечнікаў, абапіраючыся на досвед сваіх больш сталых калег, якія пасля доўгага перыяду ўсялякіх байкотаў нарэшце вырашылі змагацца за ўладу, я ўключыўся ў выбарчую кампанію. Я разглядаў гэта як магчымасць больш эфектыўна адстойваць інтарэсы моладзевай арганізацыі, кіраўніком якой мяне абралі, як чарговы крок да дэмакратызацыі нашага жыцця, актывізацыі берасцейскай моладзі. Нарэшце, як прыклад актыўнага адстойвання правоў маладых людзей.

У маю ініцыятыўную групу ўваходзілі студэнты, маладыя выкладчыкі - мае добрыя сябры і суседзі. Як бачыце, людзі адукаваныя, разумныя, пра якіх можна шчыра казаць, што гэта эліта берасцейскай моладзі. За маё вылучэнне кандыдатам яны сабралі 564 подпісы, пры неабходных па закону 75. Улічваючы тое, што ўсе яны прайшлі адпаведнае навучанне, у сапраўднасці кожнага з гэтых подпісаў я ўпэўнены на 100 адсоткаў. Але ж у выбарчую камісію для рэгістрацыі мяне кандыдатам мы падалі 83 подпісы - тыя, што не маглі выклікаць ніякага падазрэння не тое, што ў нас, але ні ў каго іншага.

Нягледзячы на гэта, члены Брэсцкай гарадской выбарчай камісіі ўмудрыліся знайсці ў падпісных лістах 9 несапраўдных подпісаў (быццам бы дату подпісу выбаршчыкі ставілі неўласнаручна) і адмовілі мне ў рэгістрацыі. Прычым мне не сказалі, чые подпісы былі пастаўлены пад сумнеў.

Натуральна, што маючы права абскардзіць гэтае рашэнне, я звярнуўся ў абласную выбарчую камісію, а пасля і ў абласны суд з просьбай адмяніць неабгрунтаванае рашэнне. У якасці доказаў мы сабралі пісьмовыя заявы ўсіх 83 выбаршчыкаў, дзе яны падцвердзілі, што сапраўды дату подпісу, як і сам подпіс, ставілі ўласнаручна.

На судзе высветлілася, што подпісы маіх выбаршчыкаў правяраў В.Калужа, 1-ы сакратар гаркама БРСМ, сябра выбарчай камісіі, а таксама В.Гарбузаў, таксама член БРСМ, які не з'яўляецца сябрам выбарчай камісіі. Закон дазваляе праводзіць праверку подпісаў толькі сябрам выбарчай камісіі, і, значыць, ужо тут можна казаць пра парушэнне выбарчай камісіяй заканадаўства.

Тут варта прыгадаць, што па маёй акрузе балатуецца С.Пінчук, які таксама з'яўляецца членам БРСМ. Відавочна, што гарачыя БРСМ-аўскія хлопцы не маглі не дапамагчы свайму сябру, нават калі прыйшлося "трошкі" парушыць закон.




Фота: IREX/ProMedia

Закон, дарэчы, патрабуе, каб выбаршчык пісьмова пацвердзіў факт неўласнаручнага напісання даты подпісу. Такіх пацвярджэнняў у выбарчай камісіі не было. Акты, на падставе якіх подпісы былі прызнаныя несапраўднымі, складаліся В.Калужай і В.Гарбузавым пасля, так бы мовіць, у вольны час. Таксама высветлілася, што В.Калужа не заўжды задаваў прамое пытанне выбаршчыкам, ці самі яны ставілі дату подпісу. Праверка подпісаў праводзілася па наступнай схеме: "Гэта Ваш подпіс?" - "Так", "А ўсё астатняе хто запаўняў?" - "Член ініцыятыўнай групы".

**Заканчэнне на с. 3**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ВЫЙШЛА НОВАЯ КНІГА ВОЛЬГІ ІПАТАВАЙ

У сядзібе Партыі БНФ прайшла прэзентацыя кнігі пісьменніцы Вольгі Іпатавай «Альгердава дзіда». У кнігу ўвайшлі тры гістарычныя раманы, прысвечаныя эпосе станаўлення Вялікага княства Літоўскага і асобам, якія аказалі значны ўплыў на фармаванне першай беларускай дзяржавы.

Уступнае слова да прысутных сказаў старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка. ¨н адзначыў выключную ролю Вольгі Іпатавай як пісьменніцы для беларускай літаратуры і як чалавека - для станаўлення беларускага грамадства. Зазначыў, што ў часе відавочага крызісу, які сёння перажывае беларуская інтэлігенцыя, Вольга Іпатава застаецца прыкладам непахіснасці і прынцыповасці ва ўсіх пытаннях, што тычацца беларускасці. Як «набытак беларускай нацыі» акрэслілі Вольгу Іпатаву сябры пісьменніцы. Яны адзначылі ўнікальнасць і значнасць прэзентаванай кнігі, пажадалі твоцы плённай працы і хутчэйшага з'яўлення новых кніг.

**Паводле BARCNEWS**

### ЮРЫДЫЧНАЯ ДАПАМОГА ДЛЯ НДА

Выканаўчае бюро Асамблеі няўрадавых арганізацый паведамляе аб пачатку працы сістэмы калектыўнай абароны няўрадавых арганізацый. Каб атрымаць юрыдычную дапамогу, прадстаўнікі НДА могуць звяртацца да наступных асобаў:

**Менск і Менская вобласць:** Уладзімер Лабковіч, (029) 6516126, (017) 2310844, labkovic@yahoo.com; **Магілёўская вобласць:** Барыс Бухель, (0222) 444210, viasna@tut.by; **Гарадзенская вобласць:** Аляксандр Антанюк, (029) 6564163, (0152) 446143, bhc_hrodna@yahoo.com; **Віцебская вобласць:** Павал Качан, (029) 6010397, abarona_viciebsk@torba.com; **Берасцейская вобласць:** Вікторыя Састраўчук, (0162) 201395, wiktoria@tut.by; **Гомельская вобласць:** Юлія Іванова, (029) 6481396, dapamoga2002@yahoo.com.

**Dzedzich week-news**

### ОН ДОЛЖЕН УЙТИ

Лозунг "ОН ДОЛЖЕН УЙТИ" на вышыні 30 метраў. Менавіта на такой вышыні на сцяне гатэля-даўгабуда з'явіўся вядомы лозунг 28 студзеня ў Берасці.

Лозунг напісаны мятровымі літарамі і таму добра бачны прахожым. З іншага боку гэтага будынку быў намалявыны бел-чырвона-белы сцяг і напісана: "Жыве Беларусь!" і крыху ніжэй: "ЗУБР".

Акрамя таго, бел-чырвона-белы сцяг быў узняты зуброўцамі над адным з самых высокіх будынкаў на праспекце Машэрава – цэнтральным праспекце горада.

**Dzedzich week-news**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет напрыканцы лютага 2003 г.**

**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 22-90-97 да 25.02.03.**

# ТРЭЦІ ТЭРМІН?

АБСАЛЮТНАЯ БОЛЬШАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ СУПРАЦЬ ТРЭЦЯГА ПРЭЗІДЭНЦКАГА ТЭРМІНУ ДЛЯ А.ЛУКАШЭНКІ. ПРА ГЭТА СВЕДЧАЦЬ ВЫНІКІ АПОШНЯГА АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНАГА САЦЫЯЛАГІЧНАГА АПЫТАННЯ, ПРАВЕДЗЕНАГА НЕЗАЛЕЖНЫМ ІНСТЫТУТАМ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ. АПЫТАННЕ ТАКСАМА ЗАСВЕДЧЫЛА РОСТ НЕЗАДАВОЛЕНАСЦІ ГРАМАДЗЯН СВАІМ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ СТАНОВІШЧАМ.

Апошнія публічныя выказванні А.Лукашэнкі пра тое, што ён гатовы ўзяць удзел і ў наступных прэзідэнцкіх выбарах, правёўшы дзеля гэтага рэферэндум па змене Канстытуцыі, перавялі гэтую праблему з ліку гіпатэтычных у практычныя і надалі ёй вострае грамадскае гучанне. Рэалізацыя праекту "трэці тэрмін", як назвалі яго сацыёлагі, залежыць найперш ад адносін да яго з боку грамадства.

Паводле звестак НІСЭПД, беларуская наменклатура ў цэлым не жадае, каб А.Лукашэнка заставаўся прэзідэнтам яшчэ на адзін тэрмін. Не жадае гэтага і большасць выбаршчыкаў. 57% апытаных сацыёлагамі выказваюцца супраць адмены канстытуцыйнага абмежавання, якое не дазваляе А.Лукашэнку займаць прэзідэнцкую пасаду болей чым два тэрміны запар. Толькі 27,6% апытаных падтрымліваюць такую адмену. Больш як палова (50,7%) апытаных гатовыя таксама галасаваць "супраць" такога змянення Канстытуцыі на рэфэрэндуме, "за" — толькі 22%.

Праўда, у параўнанні з папярэднім, верасьнёўскім, апытаннем нязначна вырасла колькасць прыхільнікаў трэцяй кадэнцыі А.Лукашэнкі на прэзідэнцкай пасадзе. Гэты рост адбыўся за кошт тых, хто раней вагаўся, прычым, пераважна з ліку людзей з нізкім узроўнем адукацыі, старэйшага ўзросту, жыхароў вёсак. Вось як ацэньвае гэтую дынаміку намеснік дырэктара Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў Аляксандр Сасноў:

**Сасноў:** "Нягледзячы на невялікае павелічэнне колькасці тых, якія гатовыя перарабіць Канстытуцыю "пад Аляксандра Лукашэнку", у цяперашняй улады на справе няма ніякіх прычынаў для радасці. Яе поспех толькі ў тым, што ўдалося мабілізаваць свой традыцыйны электарат. Аднак большасць грамадства выказваецца супраць адмены канстытуцыйнага абмежавання прэзідэнцтва двума тэрмінамі, і гатовая выказаць такую сваю думку на гіпатэтычным рэферэндуме. Такім чынам, шанцы на рэалізацыю праекту "трэці тэрмін для А. Лукашэнкі" ніяк не павысіліся".

Цікава, што колькасць праціўнікаў трэцяга тэрміну А.Лукашэнкі амаль супадае з колькасьцю рэспандэнтаў, якія лічаць, што справы ў Беларусі развіваюцца ў няправільным кірунку — такіх 54%. Хаця пасля мінулых выбараў гэтая лічба складала ўсяго 38%. Такім чынам, істотная частка электарату лічыць, што іх спадзяванні напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў былі марнымі, што свае перадвыбарчыя абяцанні А.Лукашэнка выканаць не здолеў ці не захацеў.

**Сасноў:** "Пры гэтым важна падкрэсліць, што насельніцтва не мае нейкага істотнага аптымізму адносна перспектыў паляпшэння сацыяльна-эканамічнай абстаноўкі ў краіне. 43% апытаных упэўненыя, што сітуацыя ў наступныя гады толькі пагоршыцца, 29% лічаць, што нічога не зменіцца. І толькі кожны восьмы з апытаных мяркуе, што магчымы пазітыўныя змены. І дынаміка грамадскай думкі паказвае, што колькасць такіх аптымістаў імкліва памяншаецца", — зазначыў намеснік дырэктара Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў Аляксандр Сасноў.

**Паводле РАДЫ¨ СВАБОДА**

# РЭФОРМА ПРАВАПІСУ

НОВУЮ РЭДАКЦЫЮ ПРАВІЛ АРФАГРАФІІ І ПУНКТУАЦЫІ ЎХВАЛІЎ ПРЭЗІДЫУМ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК.

Аднак, як паведаміў дырэктар Інстытута мовазнаўства акадэмік Аляксандр Падлужны, змены не кранаюць асноўных прынцыпаў правапісу, а толькі пазбаўляюць яго некаторых выключэнняў. Якія ж гэта выключэнні, і як цяпер, згодна з прапанаванымі зменамі, трэба пісаць некаторыя беларускія словы ў афіцыйным правапісе? Аляксандр Падлужны тлумачыць:

- У 1959 годзе раптам зрабілі выключэннямі словы "дзявяты" і "дзясяты". Да гэтага яны пісаліся праз "я", а тады сталі іх пісаць праз "е". Гэта мы вярнулі. Другое. Дапусцім, у нас пішуць "посны" — гэта звязана са словам "пост". А вось ужо "кампост", дык — "кампостны", як выключэнне. Таму што кажуць, што гэтае слова нядаўна запазычанае, ці што… Мы прапанавалі "кампосны" пісаць такім жа чынам, як і "посны".

Акадэмік Падлужны сказаў таксама, што прыведзены да адзінага варыянту напісання назоўнікі, якія заканчваюцца на "-ыё", "-ыо". Цяпер з "ё" будзе пісацца не толькі слова "радыё", але і "трыё", "Токіё" і падобныя словы. Змены закрануць таксама правілы напісання асобных словаў з вялікай літары і правілы пераносу.

Гэтымі нязначнымі прапановамі завершылася мовазнаўчая праца, распачатая яшчэ ў 1993 годзе. Тады паводле рашэння Ураду краіны была створаная дзяржаўная камісія. Яе ўзначаліў народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, які быў тады старшынёй дэпутацкай камісіі па адукацыі і культуры. Высновы працы гэтай камісіі былі апублікаваныя ў верасні 1994 года. Але на заканадаўчым узроўні яны не разглядаліся. Пасля была яшчэ мовазнаўчая праца грамадскай камісіі, створанай пры Таварыстве беларускай мовы. Яе высновы таксама былі надрукаваныя, але юрыдычнага працягу не мелі. Дарэчы, ачольваў тую камісію вядомы мовазнаўца прафесар Генадзь Цыхун, якога, як і іншых знаных лінгвістаў, да далейшай працы, ужо на акадэмічным узроўні, не запрасілі. Спадар Падлужны кажа, што ў гэтым не было неабходнасці, бо іх прапановы ўлічаныя працоўнай групай навукоўцаў, якую ён ачольвае. На пытанне, наколькі поўна ўлічаныя прапановы папярэдніх камісіяў, ён адказаў:

- Калі яны падыходзяць і не разбураюць правапіс, тады яны ўлічаныя, а калі не, дык не… Праект зменаў правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі камісія Падлужнага накіравала ў Міністэрствы адукацыі і інфармацыі. Адтуль прапановы мовазнаўцаў з заўвагамі чыноўнікаў будуць накіраваныя на зацвярджэнне ва ўрад. Паралельна ў Інстытуце мовазнаўства ідзе падрыхтоўка новага выдання слоўніка беларускай мовы, у які ўносяцца прапанаваныя змены.

**Паводле РАДЫ¨ СВАБОДА**

# ВЫБАРЧЫ ФАРС

Заканчэнне. Пачатак на с. 1

Выбаршчыкі, па іх словах, думалі, што іх запытваюць, хто ўвогуле запаўняў падпісны ліст. І на падставе такіх адказаў В.Калужа прыходзіў да высновы, што дату подпісу выбаршчык не ставіў.

Увогуле паводзіны сведкі В.Калужы ў судзе нагадвалі мне капітана-СМЕРШаўца з вядомай стужкі М.Пташука "У жніўні 44-га", калі ён, у самай напружанай сцэне раскручваў на лясной паляне шпіёнаў, прыкідваючыся гэткім праставатым тылавым шчурам з камендатуры. Той, хто глядзеў гэты фільм, зразумее.

У суд былі выкліканы 5 выбаршчыкаў, чые подпісы былі прызнаныя несапраўднымі (яшчэ чатыры не змаглі прыйсці па прыватных прычынах). Усе яны заявілі, што дату подпісу і сам подпіс ставілі самі, уласнаручна.

Але ўсе сабраныя намі доказы суд не палічыў дастатковымі і адмовіў мне ў задавальненні маёй скаргі.

Усе прысутныя на судзе – сведкі, назіральнікі, сябры ініцыятыўнай групы – горка смяяліся, калі суддзя Г.Алесік, нягледзячы на ўсю бясспрэчнасць нашых доказаў, вынесла адмоўнае рашэнне. Гэта ў чарговы раз сведчыць аб сапраўднай «незалежнасці, аб'ектыўнасці і непрадузятасці» нашай судовай сістэмы.

Сапраўды, суд не мог вынесці рашэння на маю карысць. Гэта б азначала прызнанне гарадской выбарчай камісіі некампетэнтнай і мела б сур'ёзныя наступствы для ўсяго выбарчага механізму, які, па словах уладаў, працуе ў нас бездакорна. Такіх судовых спраў у апошнія дні ў нашай краіне прайшло вельмі шмат. І ніводная з іх не была на карысць патэнцыйных кандыдатаў, хаця праўда была на іх баку. Гэта азначае, што:

- нашая судовая сістэма, цалкам падкантрольная ўладам, ніколі не прыме рашэнне, якое б разыходзілася з пазіцыяй "вертыкалі";
- у нашай беларускай Феміды не толькі вочы заплюшчаныя, але і вухі заткнутыя, і рукі звязаныя;
- выбары ў мясцовыя Саветы будуць такімі ж роўнымі і справядлівымі, як падзел здабычы ў ваўчынай зграі.

Праграма, якую я збіраўся ажыццяўляць у гарадскім Савеце, прынесла б вялікую карысць берасцейцам, і, у першую чаргу, моладзі. Вось толькі невялічкія вытрымкі з яе:

«Наша моладзь павінна ведаць, што дзяржава забяспечыць іх прыстойнай, высокааплочваемай працай, якая дазволіць утрымліваць сям'ю, жыць ва ўласнай кватэры, выхоўваць дзяцей і ўпэўнена глядзець у будучыню.

На працягу года ў супрацоўніцтве з гарадамі-партнёрамі Берасця ў Польшчы, Літве і Нямеччыне будзе наладжана сістэма працаўладкавання моладзі на сезонныя работы. Кожны малады берасцеец будзе мець магчымасць зарабіць у летні перыяд на законнай і добрааплочваемай працы.

Пры дапамозе моладзевых арганізацый Беларусі і суседніх краін і пры падтрымцы гарадскіх уладаў будуць праводзіцца міжнародныя сустрэчы школьнікаў і студэнтаў, летнія лагеры, экскурсіі, праграмы міжнародных абменаў. Кожны малады чалавек зможа пашырыць свой кругагляд, завязаць знаёмствы, знайсці новыя захапленні.

Будзе павялічана колькасць клубаў па інтарэсах пры школах і пазашкольных установах, створаны новыя моладзевыя клубы, арыентаваныя на патрэбы сучаснай моладзі (сучасныя танцы, аэробіка, інтэрнэт, музыка). Прычым наведваць іх дзеці змогуць бясплатна».

Гэтую праграму я ажыццяўляю і буду ажыццяўляць як кіраўнік моладзевай арганізацыі, але вельмі сумна, што нам не далі магчымасці праводзіць яе на больш высокім узроўні. Разам з тым абяцаю, што мы не спынім сваіх намаганняў прыйсці ў гарсавет. Галоўны наш козыр - наша маладосць, і я спадзяюся, што на наступных выбарах мы выставім у гарсавет ужо не аднаго чалавека, а цэлую каманду.

А ўсім, хто, як і мы, жадае перамен, мы прапануем прыходзіць да нас, каб разам ствараць сваю будучыню. **Тэлефануйце: (0162) 22-90-97.** Мы адкрыты для новых людзей. Чым больш нас будзе, тым мацней прагучыць наш голас.

**Дзмітрый ШЫМАНСКІ,**
**Старшыня Рады БАМГА «Сузор'е»**

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАДТРЫМКА «МЁРТВЫХ ДУШ»

ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2001 ГОДА АДКРЫЛІ ВОЧЫ НА ТОЙ ФАКТ, ЯКІ НЕ ЖАДАЛІ БАЧЫЦЬ ТОЛЬКІ "ВЕРТЫКАЛЬШЧЫКІ": МОЛАДЗІ НЕ ПАТРЭБЕН ПРЭЗІДЭНТ ЛУКАШЭНКА.

Мабыць, для Лукашэнкі гэта быў удар ніжэй пояса, таму як адразу пачаліся "рэпрэсіі" ў адносінах да ўсіх "нячэсных" працаўнікоў кіруючых органаў, якія не змаглі прывіць татальную ды пагалоўную любоў да яго свяцейшаства. Наступным крокам па ажыццяўленні палітыкі прывівання "патрыятызму" ды "любові" маладому пакаленню да Беларусі і Лукашэнкі стала павышэнне ўвагі да студэнцкай і "патрыятычнай" моладзі.

Паколькі асноўнай тэмай для размоў у 2002 г. для палітычнай "багемы" была тэма інтэграцыі, то і маладыя палітыкі з ліку БПСМ ды БСМ вырашылі "з'інтэгравацца". У выніку несезоннага "спарвання" нарадзілася на свет такая "арганізацыя", як БРСМ.

А далей пачало адбывацца тое, што прадугледжвалі палітычна свядомыя ды проста свядомыя людзі: 13 студзеня 2003 г. выходзіць у свет чарговы Указ Лукашэнкі пад назвай: «О государственной поддержке общественного объединения «БЕЛОРУСКИЙ РЕСПУБЛИКАНСКИЙ СОЮЗ МОЛОД¨ЖИ».

Са зместу Указа вынікае, што кіруючая вяршыня "патрыятычнай" моладзі абавязкова павінна ўключацца "в состав коллегий Министерства информации, Министерства культуры, Министерства образования..." Як вынік, па-першае - некампетэнтныя ды нявопытныя асобы ўвойдуць у склад шэрагу міністэрстваў, якія і да таго ўжо перапоўнены асобамі падобнага тыпу. А па-другое - Лукашэнка імкнецца узмацніць свой аўтарытарны парадак, які ўжо пачаў хістацца ў розныя бакі, праз размяшчэнне ў кіруючых органах своеасаблівай "пятай калоны". Такім чынам, на маю думку, узнаўляецца кругавая парука - чыноўнікі прыглядаюць за "патрыятычнай" моладдзю і дакладаюць аб іх паводзінах Бацьке, а тыя ў сваю чаргу - імкнуцца падняцца па кар"ернай лесвіцы як мага вышэй, і зрабіць гэта можна толькі шляхам вызвалення месцаў, якія прыгрэлі чыноўнікі са стажам.

Пры ўсім гэтым з мясцовых бюджэтаў у абавязковым парадку павінна быць выдзелена пэўная сума грошаў на развіццё і падтрымку дзейнасці БРСМ. Атрымліваецца так, што фінансавую падтрымку атрымліваюць толькі "чэсныя" моладзевыя арганізацыі (дакладней сказаць - толькі адна, палову "членаў" якой складаюць «мертвыя душы»).

Бачна па ўсім, што Лукашэнка баіцца моладзі. ¨н зразумеў, што будучыня краіны залежыць не ад пенсіянераў, а менавіта ад маладых людзей. І выбар, які зробіць новае пакаленне, вырашыць лёс дзяржавы і лёс Лукашэнкі ў прыватнасці.

**П. МАРОЗАЎ**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТР ПАСОЛЬСТВА ЗША Ў БЕЛАРУСІ

Інфармацыйны цэнтр пасольства ЗША (IRC) з'яўляецца даведачна-інфармацыйнай службай пасольства ЗША ў Беларусі. Асноўная місія Цэнтра – прадастаўленне надзённай і даставернай інфармацыі пра Злучаныя Штаты Амерыкі і па пытаннях, важных для развіцця амерыканска-беларускіх адносін, з мэтай аказання інфармацыйнай падтрымкі праграмам, якія ажыццяўляюцца пасольствам ЗША ў Рэспубліцы Беларусь.

Інфармацыйны цэнтр прадастаўляе ўсе паслугі па атрыманні інфармацыі бескаштоўна.

Запіс на працу з інфармацыйнымі рэсурсамі Цэнтра ажыццяўляецца штодня з 9.00 да 17.00 па тэл. (017) 211 06 76. У выходныя і святочныя дні Цэнтр не працуе.

Кантактныя адрэсы:
220030 г. Менск, вул. Герцэна, 2А, тэл.: 211 06 76; факс: 211 03 84.
E-mail: irc@usembassy.minsk.by
Internet: www.usembassy.minsk.by

**Dzedzich week-news**

### ГРЫП СТРАШНЕЙ ЗА СНІД

По информации американского Центра по контролю и профилактике заболеваний смертность от гриппа и его осложнений за последние десятилетия возросла почти в два раза. По числу жертв он более чем в два раза опережает в настоящее время СПИД. По мнению исследователей, рост заболеваемости и смертности от гриппа связан, прежде всего, с увеличением в возрастной структуре популяции доли пожилых людей. У людей старше 85 лет смертность от инфекции превышает среднюю в 16 раз. Источник: Environment News Service (ENS).

**ЭКАДОМ-ПРЭС**

### БЕЗ МІНУЛАГА НЯМА БУДУЧЫНІ

Акцыю пад такой назвай рыхтуе ініцыятыўная група моладзі г. Кобрына пры падтрымцы ГА "Давер", сумесна з цэнтрам "Гармонія", прэс-клубам "Прэс-бумеранг" і Домам Творчасці Юных (ДТЮ).

Праграма акцыі ўключае выставу малюнкаў і фотаздымкаў "Я ведаю гісторыю Кобрына", конкурс сачыненняў з далейшай публікацыяй лепшых твораў у "Прэс-бумерангу", выпуск бюлетэня, прысвечанага гісторыі Кобрына, канцэртную праграму з удзелам сяброў ДТЮ, выступленне кобрынскіх гістарычных клубаў.

Лідэр клуба "Прэс-бумеранг" Юлія Камарова распавядае: "Нам крыўдна за сваё пакаленне, за свой горад, за тое, што моладзь не ведае гісторыі месца, дзе жыве, не ведае свайго мінулага. А без мінулага няма будучыні!". Акцыя абяцае быць цікавай і яскравай. Дакладны тэрмін яе правядзення яшчэ не вызначаны, мяркуецца, што адбудзецца яна ў канцы лютага - пачатку сакавіка.

Што ж, хочацца пажадаць маладым кобрынцам поспехаў у пачэснай справе і нагадаць, што адзін з арганізатараў акцыі – клуб "Прэс-бумеранг" – да гэтага часу не мае памяшкання з нармальнымі ўмовамі для існавання. Спадарства! Прападае лепшы беларускі патэнцыял, патэнцыял прагрэсіўнай моладзі!

Тэл. для кантактаў: 8 (242) 2-54-59 (дырэктар ЭМЦ «Гармонія» Марына Алехнік, кіраўнік прэс-клуба Юлія Камарова), 8 (242) 2-15-28 (ГА "Давер"). E-mail: pressboom@yandex.ru

# МАСЯНЯ: БЫЦЬ АБО НЕ БЫЦЬ?

Я ПОМНЮ ТОТ КЛЕТЧАТЫЙ ПАКЕТИК, В КОТОРОМ Я ПРИНЕС СВОЙ МОДЕМ ДОМОЙ. ДАЖЕ НЕ ПОЕВ (!), Я СНЯЛ КРЫШКУ СИСТЕМНИКА И ВСТАВИЛ МАЛЕНЬКУЮ ПЛАТКУ В PCI ГНЕЗДО. НАЧАЛАСЬ НОВАЯ ЭРА ДЛЯ МОЕГО КОМПА. ЭРА ИНТЕРНЕТА. ПЕРВЫЙ АДРЕС, ПРИШЕДШИЙ МНЕ В ГОЛОВУ, БЫЛ WWW.MULT.RU.

З СТУДЗЕНЯ ЖЫХАРЫ ІНТЭРНЭТА І НЕ ТОЛЬКІ СВЯТКАВАЛІ ДЗЕНЬ МАСЯНІ. ДЛЯ ТЫХ, ХТО НЕ ВЕДАЕ МАСЯНЮ У ДЗЬВУХ СЛОВАХ ПАТЛУМАЧУ: МАСЯНЯ – АНІМІРАВАНЫ ПЕРСАНАЖ ЖАНОЧАГА ПОЛУ, ЯКІ ЖЫВЕ НА СТАРОНЦЫ WWW.MULT.RU І ЗАЙМАЕЦЦА ... ВОСЬ У ГЭТЫМ МЕСЦЫ, ЯК КАЗАЎ КЛАСІК: "ПАПРАШУ ПАДРАБЯЗНЕЙ!"

Тогда на винчестере валялись только два мульта про Масяню. Сейчас же все, что есть на сайте, включая обои и скринсейверы, перекочевало на мой компьютер. Но последние серии про питерскую мультяшку я скачиваю только ради полноты коллекции. Я уважаю тех людей, которые за два года сделали из обыкновенной флэшки культ. Но время и телевидение, боюсь, безнадежно убили то, что присутствовало в «Подарочках» и «Радио».




Идиотские шутки без цензуры и какое-то «раздолбайство», которые и притягивали к себе внимание. Мне кажется, что Масяня начала портиться со времени своего перехода на голубой экран. До этого времени о ее существовании знал лишь определенный круг людей и делалась она именно для них. А приход «в массы» ничего хорошего не принес. Даже наоборот.



Последней каплей стала новогодняя серия. Помните прошлогоднюю «Давай потрахаемся»? Теперь же авторы ударились в высшие материи и сентиментальность. Да, и раньше были «душевные» мульты. Типа «Депресняка». Но они были какие-то… другие. С хорошим концом и земной философией. Про нас и для нас.



Все, что здесь написано, является лишь моим сугубо личным мнением. Возможно, кто-то скажет, что я абсолютно не прав. Просто очень хотелось высказаться. То, что стало с Масяней, мне не нравится. Может повзрослела она? Но хотелось бы, чтобы мульты были не чьей-то биографией (тогда в конце кто-то обязательно должен умереть), а просто флэшкой-развлечением. А о тех глобальных проблемах, которые не сразу и не нами решаются можно и в газетах прочитать.

**P.S.** В то время, как материал уже верстался, появился следующий мульт, который заставил меня слегка поменять свое мнение. Но переписывать я ничего не стал, так как никогда от своих слов не отказывался - :).

**Troll (sever3@tut.by)**

На пачатку свайго існавання Маська то Дзень народзінаў святкавала, то ў госці да Хрундзеля (ейны бой-фрэнд) на радыё прыходзіла, вяла замежныя экскурсіі па Пецярбургу і нават выступала на адной сцэне разам са СПЛІНАМ.




Як сапраўдную жывую істоту, Маську наведвалі і душэўныя крызісы (дастаткова прыгадаць адзін з найлепшых мультоў пад назвай "Дэпрэсняк"). Карацей кажучы, Масянька займалася ўсім тым, чым толькі можа займацца рэальная дзяўчына. Таму і няма нічога дзіўнага, калі аніміраваны персанаж пачаў жыць сваім асобным, непадобным на нечы дрэнны (або добры) мульцяшны сцэнар.

З моманту з'яўлення Масяні на прасторы Interneta, можна заўважыць, як адбываецца сталенне і станаўленне персанажа. Жарты пачалі набываць добры густ, заўважаецца памяншэнне вульгарызмаў ды пошласці.

У мультфільмах назіраецца філасофскі падтэкст, які вымушае (у добрым сэнсе гэтага слова) ўспрымаць прагледжанае не толькі як flash-аўскі мульт, але і як сцэны з рэальнага жыцця.

На мой погляд, аўтары дасягнулі (наўмысна або раптоўна – не ведаю) таго, што іхні персанаж пачаў жыць незалежна ад рэдактараў, сцэнараў і ўсяго астатняга.

Усё гэта і прымушае сачыць за жыццём Маські і ейных сяброў з тым азартам, які назіраўся на пачатку з'яўлення мульта.

**ICE**

НІЖЭЙ ПРЫВОДЗІМ ВАМ НЕКАЛЬКІ ВЯДОМЫХ ВЫКАЗВАННЯЎ ГЭТАГА АНІМАВАНАГА ПЕРСАНАЖА

Да ладно тебе! Работает он... Пойдем-ка покурим-ка!

Але! Кто это? Директор?! Да пошел бы ты в ж.., директор. Не до тебя сейчас...

Пошли на пол-часика, посидим, по одной кружечке выпьем по-любому...

Да мне бы домой бы...

Здрасьте вам!

Что вы, кто вы, кто вы, что вы?..

У, дорогуша... Какой замечательный компакт-диск! Компактный такой компакт-диск...

Ну и что вы хотите делать в шоу-бизнесе с такой ж... э-э-э... фигурой?

Чисто физический секс меня не интересует. Я вот обязательно думаю, что всегда должно быть какое-то чувство. Накуриться вместе, или напиться...

Эта... Але! Эта, как его?.. Привет!

Автолюбитель, стой! Стой, автолюбитель!

Да ну вас! Козлы вы все...

А еще под нашу музыку еще можно много чего делать...

# «СУЗОР'Е» - БУДЗЬ РАЗАМ З НАМІ!

КАЛІ ЁСЦЬ У ЦЯБЕ НА СВЕЦЕ ЧАЛАВЕК, ДА ЯКОГА МОЖНА ЗВЯРНУЦЦА ЗА ДАПАМОГАЙ І ЗА ПАРАДАЙ, ТАДЫ ТЫ - САПРАЎДНЫ ШЧАСЛІВЕЦ. А ШТО Ж РАБІЦЬ ТЫМ, КАМУ, НАПРЫКЛАД, ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ І ХТО НЕ МАЕ ВАКОЛ СЯБЕ НІВОДНАГА СЯБРА?

Каму ўсё здаецца цёмным і для каго жыццё прыносіць адны толькі непрыемнасці? А людзі навокал абвінавачваюць цябе ва ўсіх смяротных грахах. Што ж рабіць?

Пераходны ўзрост — гэта вельмі складанае і, на першы погляд, нявырашальнае пытанне. Але яно з'яўляецца справай вялікай значнасці не толькі для бацькоў. Ці запытвалі вы сябе калі-небудзь, што робіцца ў нашай краіне, каб адцягнуць падлеткаў ад вуліцы і ад дрэнных учынкаў? Зразумела, што існуе вялікая колькасць спецыялістаў, напрыклад, школьных псіхолагаў, але яны вырашаюць пытанні толькі на мясцовым узроўні.

А вось каб дапамагчы нашым падлеткам адчуць сябе карыснымі, на мой погляд, павінны з'яўляцца клубы ці нават арганізацыі, якія б дазволілі актыўнай моладзі знайсці сваё месца ў грамадстве. Вось я, калі мне было чатырнаццаць год, толькі марыла, і нічога больш. Мне здавалася, што яшчэ некалькі крокаў, і ў мяне ўсё атрымаецца.

А калі адбывалася нешта дрэннае, я рабілася зусім замкнёная і сумная. І вось у такія хвіліны мне была патрэбна парада аднагодкі, чалавека, які ведаў бы мае пачуцці як свае. Які адразу прапанаваў бы мне цікавую і карысную справу. Таму зараз я звяртаюся да школьнікаў з прапановай:

– Калі вы жадаеце быць патрэбнымі і знайсці сябе ў нейкай галіне, калі вам не хапае сяброў і падтрымкі, запрашаю вас наведаць БАМГА «Сузор'е» і жадаю ўсяго найлепшага!!!

**Мы чакаем вас у нядзелю, 9 сакавіка, у 12$^{00}$ па адрасу: вул. Жураўліная, 20 (прыпынак «Зялёная»).**

**Марыя ЕСІНА**

# С ДНЕМ СВЯТОГО ВАЛЕНТИНА!

ДЕНЬ СВЯТОГО ВАЛЕНТИНА КАК ПРАЗДНИК ВЛЮБЛЕННЫХ ОТМЕЧАЕТСЯ 14 ФЕВРАЛЯ В ЕВРОПЕ С XIII в, В США - С 1777 г. А ПОСЛЕДНИЕ ГОДЫ В СТРАНАХ СНГ СТАЛА ПОЯВЛЯТЬСЯ НОВАЯ ТРАДИЦИЯ – ОТМЕЧАТЬ, КАК ЭТО ДЕЛАЕТСЯ НА ЗАПАДЕ – ПРАЗДНИК ВСЕХ ВЛЮБЛЕННЫХ: ДЕНЬ СВЯТОГО ВАЛЕНТИНА. СЕКРЕТ ПОЗДРАВЛЕНИЯ В ЭТОТ ДЕНЬ ПРОСТ: ДЛЯ ТОГО, КОМУ ОНО АДРЕСОВАНО, ПОЗДРАВЛЕНИЕ ЯВЛЯЕТСЯ СВОЕОБРАЗНЫМ ОБЪЯСНЕНИЕМ В ЛЮБВИ.

Не случайно же западные "валентинки" (открытки в честь дня святого Валентина) выполнены в форме сердца либо украшены сердечками. Кроме того, уместными в этот день будут печенье, леденцы в форме сердечек, а также игрушки и сувениры аналогичной формы.




Вся прелесть подарка в том, что он не вручается явно, а потихоньку "подкладывается" на стол, в книгу, в почтовый ящик адресату. Догадается ли тот, кто получит поздравление, от кого оно? Для тех, кто догадается, такой подарок может стать двойной радостью. Для робких и нерешительных анонимность поздравления – великое подспорье в выражении чувств.

А теперь небольшой экскурс в историю… О жизни реального христианина Валентина (родился в III в. н. э. в г. Терни, Римская империя) почти ничего не известно. Скудные факты трагической биографии выкраиваются из противоречащих друг другу легенд.

Рассказывают, что епископ Терни, будучи молодым человеком, оказывал юным влюбленным особое расположение: помогал писать письма с признаниями в любви, мирил поссорившихся, дарил цветы молодым супругам. Арест его был вызван якобы тем, что римский император Юлий Клавдий II не позволял солдатам имперских легионов влюбляться и жениться, а Валентин тайно венчал легионеров. Когда Валентин сидел в тюрьме, он якобы влюбился в слепую дочь своего палача и исцелил ее.

Говорят, правда, что дело было наоборот: надзиратель попросил Валентина излечить дочь, а та влюбилась в опального священника. Перед казнью он оставил ей прощальную записку и подписался: "Твой Валентин". Отсюда и открытки "валентинки" (в ходу с 1800-х гг.), и сам праздник.

Дата казни св. Валентина совпала с римскими торжествами в честь Юноны, богини любви. Этот день в Риме считали началом весны.

Сегодня День святого Валентина вырвался далеко за рамки сугубо католического и стал самым что ни на есть массовым, самым любимым у многих народов торжеством. Всех праздничных безумств, которые совершают вполне серьезные люди в День св. Валентина, перечислить невозможно.

Что там открытки в виде сердечек! Что там конфеты, духи и цветы! Что драгоценности, как принято во Франции!

Способна ли, например, "железная леди" Америки, госсекретарь Мадлен Олбрайт обходить участников заседания Совета Безопасности ООН, вручая каждому по красивому мешочку со сладостями? Способна - в День св. Валентина.

Способны ли свирепые перуанские террористы пропускать к своим заложникам посредников с шоколадками и компакт-дисками? Безусловно. Так было в День св. Валентина.

Классической эмблемой Валентинова дня считаются красные розы, которые, согласно античной легенде, появились благодаря греческой богине любви и красоты: Афродита, торопясь к своему любимому Адонису, наступила на куст белых роз, и ее божественная кровь обагрила их в красный цвет.

14 февраля – день повышения производительности труда почтовых работников и день сверхприбылей торговцев цветами и сувенирами. В США в прошлом году в этот день покупали 24 тысячи роз в минуту. Счет электронных посланий в Internet идет 14 февраля на миллионы.

Трудно сказать, какой еще праздник так популярен, как день влюбленных. В этот день влюбленные дарят друг другу подарки и открытки-валентинки. Большая часть "валентинок" анонимна, не имеет обратного адреса, написана справа налево или левой рукой.

Каждый народ отмечает день святого Валентина по-разному. Британцы, например, в День святого Валентина посылают любовные послания не только друзьям и знакомым, но и своим домашним животным (не правда ли, очень мило с их стороны).

Японцы же оказались более оригинальны - они переделали 14 февраля в своеобразное "8 Марта для мужчин", когда подарки получает в основном сильный пол.

**Максим СЕЛЯГИН**

СМАЧНА ЕСЦІ!

# БЕЛАРУС БЕЗ БУЛЬБЫ?!

ДЛЯ КОЖНАГА НАРОДА ХАРАКТЭРНА СВАЯ АДМЕТНАЯ РЫСА, ШТОСЬЦІ ТАКОЕ, ПА ЧЫМ ВЫ ВЕЛЬМІ ПРОСТА ВЫЗНАЧЫЦЕ, ХТО ЁН ТАКІ. ГЭТА МОЖА БЫЦЬ ВОПРАТКА, МАНЕРА РАЗМАЎЛЯЦЬ, ЦІ, НАПРЫКЛАД, СТРАВА. НЕ ЦЯЖКА ЗДАГАДАЦЦА, ШТО З'ЯЎЛЯЕЦЦА АДМЕТНАЙ РЫСАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУХНІ, АЛЕ БУЛЬБА – ГЭТА ТОЛЬКІ КРОПЛЯ Ў ВЯЛІКІМ АКІЯНЕ СТРАЎ.

Наша родная кухня вызначаецца ўжываннем нацыянальных гатункаў хлеба ў асноўным з аржаной мукі, вялікай разнастайнасцю страў з гароднiны, грыбоў, дзікарослых раслін. Але сення ў нас пойдзе размова якраз пра бульбу,бо яе спалучэнне з мясам, сала-мяснымі і кісламалочнымі вырабамі атрымала вялікае распаўсюджанне.

## САЛАТА БУЛЬБЯНАЯ З ЯБЛЫКАМІ І СЕЛЬДЭРЭЕМ.

Бульбу адварыць, абабраць, нарэзаць тонкімі лустачкамі.Свежыя яблыкі вызваліць ад насеннай камеры, зняць лупіны і таксама нарэзаць.Корань сельдэрэя аскрэбсці, нашаткаваць тонкай саломкай або надзерці на буйной тарцы. Усе прадукты змяшаць.Затлусціць смятанай, пасаліць па смаку.

**Складнікі:** 4 бульбы, 2 яблыкі, 1 корань сельдэрэя, 100 г. смятаны, соль.

## ЮШКА БУЛЬБЯНАЯ.

Косці, рэбры з мясам рассячы на часткі, памыць, пакласці ў каструлю з халоднай вадой, дадаць дробна нарэзаную рэпчатую цыбулю, давесці да кіпення і варыць на слабым агні. За 15-20 хвілін да канца варкі дадаць нарэзаную скрылькамі бульбу.

У канцы варкі пакласці соль, лаўровы ліст, пятрушку. Гатовую юшку пасыпаць дробна нарэзанай зелянінай.

**Складнікі:** 1,5 л. вады, 500-600 г. мяса, 5-6 бульбін, 2 цыбуліны, лаўровы ліст, пятрушка, соль.

## БУЛЬБІШНІКІ.

Бульбу адварыць у лупінах, ачысціць, прапусціць праз мясарубку, дадаць мукі і крухмалу, растопленага сметанковага масла, яйка, солі, перца, старанна перамяшаць і падзяліць на невялікія шарыкі па 15-20 г.

Бульбішнікі пакласці на змазаную маслам патэльню і запячы ў духоўцы. Затым затлусціць смятанай або падсмажыць на сметанковым масле ці на нарэзаным кавалачкамі сале з цыбуляй на працягу 5 хвілін.

**Складнікі:** 12 бульбін, 0,75 шклянкі мукі, 1 яйка, 100 г. сметанковага масла, перац, соль.

## ТАРКАВАНКА.

Сырую бульбу абабраць, памыць, надраць, дадаць соль, перац, крыху абсмажаныя дробныя кавалачкі сала з цыбуляй, прамытыя ў гарачай вадзе сухафрукты.Усё скласці ў чыгунок або таўстасценную каструлю і паставіць у духоўку.

Праз 15-20 хвілін дастаць, перамяшаць і зноў паставіць у духоўку, мяшаць яшчэ 2-3 разы, каб не прыгарэла. Падаць са сметанковым маслам і малаком.

**Складнікі:** 10 бульбін, 150 г. свінога сала, 2 цыбуліны, 100 г. сухой садавіны, перац, соль.

**Марыя ЕСІНА**

ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# ЛЮТЫ:

## 1 ЛЮТАГА

1 лютага 1863 г. – дзень пачатку антырасейскага паўстання, якое шырока вядома ў Беларусі як паўстанне **Кастуся Каліноўскага**. Літоўскі правінцыйны камітэт абвясціў сябе Часовым урадам на акупаваных Расейскай імперыяй землях Беларусі і Літвы. Быў прыняты маніфест аб пачатку паўстання і надзяленні сялян зямлёй.

1 лютага 1913 г. нарадзіўся **Сяргей Прытыцкі**. Яго імя варта згадаць хаця б таму, што ім названы вуліцы ці не ў кожным заходнебеларускім горадзе і мястэчку. Савецкая прапаганда рабіла з Прытыцкага вобраз гэткага рамантычнага героя-падпольшчыка ў міжваеннай Заходняй Беларусі. Гэта ён проста ў залі Віленскага суда расстраляў сведку на працэсе Грамады. Пасля быў прысуджаны да смяротнага пакарання, але, як кажуць, пад націскам сусветнай грамадскасці прысуд быў заменены на турэмнае зняволенне. Пасля вайны Прытыцкі займаў у БССР высокія партыйныя пасады. Пра яго геройствы нават знялі фільм "Чырвонае лісце".

## 2 ЛЮТАГА

2 лютага 1348 г. пакінуў гэты свет **Нарымунт**, князь полацкі і пінскі, сын Гедыміна, які ў хрышчэнні называўся Глебам. Нарымунта запрашалі княжыць у Ноўгарад. Цікава, што ягонай жонкай была дачка крымскага хана. А загінуў ён у баі супраць Тэўтонскага ордэна.



2 лютага 1838 г. нарадзіўся **Кастусь Каліноўскі**, ідэолаг вызвалення Беларусі з-пад расейскага панавання, кіраўнік паўстання 1863 г. Расейцы павесілі Каліноўскага ў Вільні на Лукішскай плошчы. На гэтым месцы сёння ёсць мемарыяльная табліца. Яшчэ адна табліца памяці Каліноўскага ёсць на мурах Дамініканскага касцёла, дзе змагар хаваўся ад мураўёўскага пераследу.

## 3 ЛЮТАГА

3 лютага 1927 г. – дата, якая ўвайшла ў беларускую гісторыю пад знакам Косаўскага расстрэлу. У гэты дзень у мястэчку Косава польскія ўлады расстралялі мірную дэманстрацыю людзей, якія выступалі ў абарону Беларускай сялянска-работніцкай грамады. На падтрымку грамады выйшла паўтары тысячы сялян. Дэманстранты прайшлі па вуліцы Косава, правялі мітынг. Калі яны зноў рушылі праз мястэчка, паліцыя пачала страляць. Было забіта шэсць чалавек і некалькі дзесяткаў паранена. Пахаванне забітых вылілася ў маніфестацыю пратэсту супраць свавольства паліцыі і польскай акупацыі.

## 4 ЛЮТАГА

У гэты дзень у 1746 г. нарадзіўся **Тадэвуш Касцюшка**. Поўнае імя ў яго было Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, а прыйшоў ён на свет у фальварку Мерачоўшчына пад Івацэвічамі. Напэўна, у той лютаўскі дзень ніхто са сваякоў у самых смелых фантазіях не ўявіў бы, які лёс чакае



гэтага хлапца з беларускага шляхецкага роду. А пачынаў Касцюшка сваю кар'еру па вайсковай лініі. Скончыў Варшаўскі кадэцкі корпус, наведваў заняткі ў Парыжскай вайсковай акадэміі, пасля добраахвотнікам пайшоў на вайну за незалежнасць ЗША, стаў сябрам прэзідэнта Томаса Джэферсана. У 1784 г. Касцюшка вярнуўся на радзіму і тут узначаліў антырасейскае паўстанне 1794 г. Федэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая была падзеленая паміж імперыямі. Наш край дастаўся Расеі. Супраць гэтай акупацыі і ўзнялося паўстанне на чале з Касцюшкам. У бітве пад Рацлавіцамі Касцюшкава войска разбіла расейскую армію. А ў бітве пад Мацяёвіцамі Касцюшка быў цяжка паранены і трапіў да расейцаў у палон. Патаемна, пад чужым прозвішчам "шляхціч Шымански" яго перавезлі ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Пасля вызвалення мужны змагар зноў пабываў у ЗША, а пасля вярнуўся ў Еўропу. Памёр ён у 1917 г. у Швейцарыі.

4 лютага 1808 г., акурат калі Касцюшка дажываў свае гады ў Швейцарыі, у фальфарку Панюшкавічы пад Бабруйскам нарадзіўся **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч**, беларускі пісьменнік, творы якога ўсе ведаюць са школьнай праграмы. Дунін-Марцінкевіч – першы прафесійны пісьменнік, які пісаў па-беларуску. Справа ў тым, што іншыя літаратары таго часу ў нашым краі хоць і карысталіся ў побыце беларускай мовай, але пісалі пераважна па-польску, як, да прыкладу, Адам Міцкевіч або Ян Чачот. Пісанае па-беларуску лічылася забавай або этнаграфізмам. І паэты, якія хацелі зрабіць прафесійную літаратурную кар'еру, выбіралі польскую мову. Патрабавалася пэўная адвага, каб стаць прызнаным пісьменнікам, творачы пабеларуску. Бо найперш трэба было сцвердзіць права на існаванне ў літаратуры самой мовы, а тады ўжо паказаць свой талент. Вось жа Дуніну-Марцінкевічу такой адвагі хапіла. Сілаю таленту ён здолеў пераадолець гэты бар'ер, і ніхто не ўспрымае яго як жартаўніка або этнаграфічнага пісьменніка. Ужо следам за ім, гледзячы на ягоны ўдалы прыклад, пачнуць пісаць па-беларуску і іншыя.

4 лютага 1929 г. нарадзіўся беларускі мастак **Лявон Баразна**. ¨н першы стаў складаць альбомы з выявамі беларускага народнага адзення і арнаментаў, даследаваў гравюры Францішка Скарыны. Баразну забілі пры невысветленых абставінах у 1972 г. Афіцыйная версія — хуліганы, іншыя сцвярджаюць, што гэта была правакацыя КДБ. Рэч у тым, што Баразна смела браўся за забароненыя на той час тэмы, і вакол яго галавалася шмат творчай моладзі. Пазней гэтыя вучні і сябры будуць працягваць тыя справы, якія запачаткаваў Лявон Баразна.

4 лютага 1931 г. скончыў жыццё самагубствам **Усевалад Ігнатоўскі**, беларускі гісторык, акадэмік. Ігнатоўскі займаў у Беларусі важныя дзяржаўныя пасады ў часы савецкай беларусізацыі 20-х гадоў. Але на пачатку 30-х гэтай беларусізацыі прыйшоў канец. Ігнатоўскага сталі публічна называць лідэ-



рам нацыянал-дэмакратычнай контррэвалюцыі і кулацкім агентам, пачаліся выклікі на допыты ў ГПУ. Каб усяго гэтага не чуць і не бачыць, шанаваны ў краіне чалавек мусіў зрабіць сабе смерць.

## 6 ЛЮТАГА

6 лютага ў 1898 г. нарадзіўся беларускі гісторык **Леў Акіншэвіч**. ¨н прыйшоў на свет у Санкт-Пецярбургу, вучыўся ў Кіеўскім універсітэце, але заўсёды пачуваўся беларусам. Таму, калі ў 1918г. была створана незалежная Беларуская Народная Рэспубліка, Акіншэвіч адразу прымае грама-дзянства БНР. Як гісторык ён вывучаў сярэднявечнае права і казацтва ў Беларусі. У 30-я гады бальшавікі абвінавачвалі яго адначасова ў беларускім і ўкраінскім нацыяналізме. Аднак адразу пасля вайны яму ўдалося не патрапіць у сталінскія Гулагі і ўцячы на эміграцыю. У ЗША Акіншэвіч здолеў працягваць сваю навуковую дзейнасць у Беларускім інстытуце навукі і мастацтва ў Нью-¨рку.

## 7 ЛЮТАГА

7 лютага 1546 г. ў Ляхавічах прыйшоў на свет **Фёдар Еўлашоўскі**, беларускі палітык і пісьменнік-мемуарыст. Гісторыкі адзначаюць, што Еўлашоўскі меў шырокія веды ў галіне матэматыкі, справаводства і юрыспрудэнцыі. Ездзіў паслом на соймы Рэчы Паспалітай і прадстаўляў там наваградскую шляхту. Еўлашоўскі — адзін з аўтараў тагачаснага крымінальнага кодэксу — "Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага". Ягонаму пяру належыць самы ранні твор мемуарнага жанру ў беларускай літаратуры, які называўся "Гістарычныя запіскі". З тых запісак тагачасныя людзі і край паўстаюць для нас і сёння як жывыя.

## 9 ЛЮТАГА

Як на добры лад, менавіта сёння мусіў бы адзначацца Дзень беларускага тэатра, бо якраз 9 лютага была пастаўлена першая беларуская опера. Адбылося гэта ў 1892 г. ў Менску ў тэатры, які належаў чалавеку з прозвішчам Поляк. Кампазітар Станіслаў Манюшка разам з Канстанцінам Крыжаноўскім і сябрамі напісалі музыку да п'есы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Двухактавая камедыя-опера мела назву "Сялянка" або "Вясковая ідылія". Героі ўпершыню спявалі на той мове, якой аўтары гаварылі між сабой — па-беларуску. Не па-польску, як было прынята дагэтуль. І не па-расейску — на мове акупантаў. Расейская цэнзура спахапілася: чаму на «простонародном наречіі»? Прэм'ерную афішу цэнзура расклейваць забараніла. Акцёры саматугам разносілі запрашэнні.

Спектакль выклікаў фурор. Публіка была ў захапленні. Сам драматург выступіў у ролі войта Навума, спявалі сяляне, прывезеныя з Люцынкі. Адбылося некалькі паказаў у Менску, Бабруйску, Слуцку, Глуску. Урэшце спектакль быў усё ж забаронены. Апошнюю афішу недзе ў сталінскай ссылцы згубіў Альберт Паўловіч. Ноты Станіслава Манюшкі былі згубленыя. Будынак тэатра ў Менску на рагу вуліц Леніна і Інтэрнацыянальнай, нягледзячы на пратэсты моладзі, быў знесены на пачатку перабудовы. І толькі маленькая кніжачка лібрэта,

*Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына... (Я. Купала)*

# ПАЭЗІЯ СВАБОДЫ

выдадзеная ў 1846 годзе ў віленскай друкарні Юзафа Завадзкага, датрывала да нашых дзён.

9 лютага 1867 г. пакінуў наш свет **Кароль Нямцэвіч** – славуты паўстанец і змагар за свабоду краю. Нямцэвіч скончыў Свіслацкую гімназію, вучыўся ў Віленскім універсітэце. Калі пачалося антырасейскае паўстанне 1831 г., Нямцэвіч распрацаваў план захопу Горадні і быў там паўстанцкім начальнікам. Пасля з атрадам перабраўся ў Беласток і, адступаючы ў Белавежу, каля Каралёва Моста ў бітве разбіў непрыяцеля. Пасля задушэння паўстання Нямцэвіч, тады ўжо кавалер ордэна Віртуці Мілітары, эмігрыраваў у Парыж, дзе заняўся выдавецкай дзейнасцю.

9 лютага 1886 г. нарадзіўся **Аляксандар Мяснікоў**, адзін з першых камісараў-начальнікаў БССР, які лічыў, што беларусаў як асобнага народу няма. Сапраўднае яго прозвішча – Мяснікян, і да нас ён прыбыў з Расеі разам з бальшавіцкай рэвалюцыяй. Такі сабе ваенна-камуністычны дзеяч з тых, што з гонарам любяць паўтараць: «Мы універсіцетаў не канчалі», – быццам невуку і сапраўды ёсць чым ганарыцца.

### 11 ЛЮТАГА



11 лютага 1807 г. нарадзіўся слынны дзеяч нашага краю, мастак і кампазітар **Напалеон Орда**. Орда прыйшоў на свет у Варацэвічах пад Янавым (Іванава), адукацыю атрымаў у Парыжы і ў Віленскім універсітэце. Яшчэ студэнтам Орда ўдзельнічаў у антырасейскім паўстанні 1831 г. ¨н сябраваў з Шапэнам і Міцкевічам, пісаў вальсы, мазуркі, серэнады. Орда шмат падарожнічаў па Беларусі, Літве, Польшчы і Украіне, рабіў замалёўкі помнікаў дойлідства і ўсялякіх славутых мясцін. Віды вёсак, маёнткаў, замкаў, палацаў, гарадоў, якія намаляваў Орда — часта адзінае сведчанне пра помнікі архітэктуры, якіх даўно няма ў рэчаіснасці. Таму асабліва каштоўнае тое, што Орда маляваў вельмі дакументальна, нічога не прыдумляючы. Праўда, пры гэтым у ягоных творах перададзены і настрой аўтара і сама атмасфера XIX ст. Рэпрадукцыі гэтых твораў неаднойчы выдаваліся альбомамі.

### 12 ЛЮТАГА

12 лютага 1798 г. пакінуў гэты свет **Станіслаў Аўгуст Панятоўскі**, апошні польскі кароль і Вялікі князь Літоўскі.



¨н паходзіў з беларускай шляхты і пахаваны на тэрыторыі Беларусі — у Воўчыне каля Вяліка-Літоўска. Яму прыпісваюць адначасова росквіт і заняпад краю. Сапраўды, за Панятоўскім у Вялікім княстве рабіліся вялікія пераўтварэнні і развіваліся мастацтвы, але за ім жа Княства і ўся Рэч Паспалітая была падзеленая паміж трыма імперыямі і фактычна перастала існаваць як самастойная дзяржава. Беларускія і Літоўскія землі былі захоплены Расеяй.

### 14 ЛЮТАГА

14 лютага 1907 г. нарадзіўся беларускі паэт **Алесь Звонак**. Гэта рэдкі выпадак, калі дзеяч найноўшай беларускай культуры прыйшоў на свет у цяперашняй сталіцы Беларусі - Менску. Затое лёс у паэта Звонка тыповы. У 1936-м ён быў арыштаваны і на 10 гадоў высланы ў Магадан. Вярнуўся ён ажно праз 20 гадоў. Можна сабе ўявіць, як гэта было няпроста для ўчарашняга ворага народа — вярнуцца.

Паэтам няпроста было не толькі за Сталінам. Наогул, у народзе распаўсюджана думка, што пісаць вершы — амаль тое самае, што гультайнічаць. Чаму ж тады дастаецца паэтам заўсёды ад усялякіх палітычных рэжымаў? Можа таму, што дыктатура знішчае найперш свабоду. А менавіта пішучы вершы чалавек пачуваецца найбольш вольным.

### 15 ЛЮТАГА

15 лютага — **Грамніцы** або **Стрэчанне**. Земляробчае свята сустрэчы зімы і лета. Першая назва, як мяркуюць, пайшла ад паганскага бога Грамаўніка, які ўтварае вясновыя навальніцы і дажджы. Пасля гэтага дня зімовая ўлада мусіла скончацца. Людзі казалі: "На грамніцы – паўзіміцы" або "Як прыйдуць Грамніцы – скідай рукавіцы". Менавіта так гэтае свята называлася і адзначалася ў беларускай дахрысціянскай традыцыі. А другая назва – Стрэчанне – паходзіць ад царкоўнага "Срэцення", якое народ перакруціў на простае і зразумелае.

А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне,
Зіма з летам стрэлася, стрэлася,
Лета зіму піхнула, піхнула
І ножачку звіхнула, звіхнула.
Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы.

15 лютага 1904 г. нарадзілася **Ларыса Александроўская**, ці не самая славутая беларуская оперная спявачка, чый творчы росквіт прыпаў на сталінскую эпоху. Тады некаторыя імянітыя артысты мелі ў грамадстве часам большую вагу, чым міністры. Да таго ж Ларыса Александроўская была кіраўніцай галоўнага тэатру краіны – Менскай оперы. Яна і нарадзілася ў Менску, а ў яе бацькі было незвычайнае імя — Пампей. Таму яе называлі Ларыса Пампееўна.

### 16 ЛЮТАГА



16 лютага 1757 г. у вёсцы Скокі цяперашняга Берасцейскага раёну нарадзіўся **Юльян Нямцэвіч** – слынны змагар і пісьменнік, ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі. ¨н вучыўся ў Берасцейскім езуіцкім калегіуме, пасля – у Варшаўскім кадэцкім корпусе. У часе антырасейскага паўстання 1794 г. Нямцэвіч разам з Касцюшкам патрапіў у палон і быў зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці. Пасля разам са сваім нязменным камандзірам Нямцэвіч выехаў на нейкі час у Амерыку. Вярнуўшыся на Радзіму ён браў удзел у паўстанні 1831 году. Прызнацца, цяжкавата ўявіць сабе паўстанца, якому 74 гады. Тым не менш, пасля паразы паўстання Нямцэвіч выязджае ў эміграцыю, дзе цалкам прысвячае сябе літаратурнай дзейнасці, на што Бог падарыў яму яшчэ 10 плённых гадоў. Апроч раманаў, камедый і патрыятычных песен Юльян Нямцэвіч пісаў яшчэ і мемуары, у якіх пераказваў сваё надзвычай багатае жыццё і распавядаў пра прыгажосць сваёй Радзімы – Беларусі.

### 18 ЛЮТАГА

18 лютага 1845 г. пакінуў гэты свет **Ігнат Анацэвіч**, беларускі гісторык і архівіст. Нарадзіўся ён у Малой Бераставіцы, паступіў спачатку ва універсітэт у Каралеўцы, а скончаў ужо Віленскі універсітэт, дзе пасля стаў прафесарам. Праўда, пабыў ён прафесарам усяго год, бо звінавацілі Анацэвіча ва ўдзеле ў студэнцкай арганізацыі "Плямёны сарматаў" і выслалі дахаты. А тады ўжо апынуўся ён у Пецярбургу. Вывучаў там гісторыю ВКЛ, збіраў усялякія старыя дакументы. Свае артыкулы падпісваў псеўданімам Жэгота з Малой Бераставіцы. Галоўная праца Анацэвіча – "Гісторыя Літвы" – так і не была надрукаваная, а рукапіс паводле запавету аўтара перайшоў Юзафу Крашэўскаму.

18 лютага 1893 г. нарадзіўся найбуйнейшы беларускі пісьменнік і вучоны XX ст. **Максім Гарэцкі**. Друкавацца ён пачаў яшчэ ў 1912 г. у віленскай "Нашай Ніве", таксама ў Вільні праз два гады выйшаў яго першы зборнік "Рунь". Гарэцкі быў выкладчыкам літаратуры ў Віленскай беларускай гімназіі і напісаў першы падручнік па гісторыі беларускай літаратуры. Наогул, жыццё і творчасць Гарэцкага шчыльна перапляліся з Вільняй, не аднойчы ён апісваў гэты горад у сваіх творах.

### 19 ЛЮТАГА

19 лютага 1908 г. нарадзіўся беларускі паэт **Станіслаў Шушкевіч**. ¨н найлепей вядомы як аўтар вершаў для дзяцей. А яшчэ вядомы сваім сынам – Станіславам Шушкевічам, кіраўніком Беларусі, за якім краіна набыла незалежнасць.

Наступная сённяшняя дата звязаная з папярэднім абвяшчэннем незалежнасці Беларусі. 19 лютага 1918 г. ў Менску выканаўчы камітэт Усебеларускага з'езда стварыў **Народны сакратарыят** – часовы ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі. Пазней Народны сакратарыят быў перайменаваны ў Раду БНР. Узначальваў сакратарыят Язэп Варонка. А сённяшнюю Раду ачольвае Івонка Сурвіла, якая жыве ў Канадзе.

### 27 ЛЮТАГА

27 лютага 1903 г. нарадзіўся беларускі паэт **Міхась Явар**. Сапраўднае яго прозвішча было Карась, а прыйшоў ён на свет у Мінявічах на Мастоўшчыне. Явар – з тых творцаў, якіх называюць заходнебеларускімі паэтамі, гэта значыць, што жыў і працаваў ён у міжваенны час на тэрыторыі Беларусі пад польскай акупацыяй. Друкаваўся ў віленскіх выданнях: "Беларускай газеце" і часопісе "Шлях моладзі". У даведніках яго біяграфія сканчаецца словамі: даведзены да адчаю, Явар скончыў жыццё самагубствам. І адбылося гэта ў 1933 г. Як і большасць творцаў яго пакалення, Явар пісаў вершы на сацыяльныя матывы і збавення душы шукаў па-за царквою, адмаўляючы як буржуазныя, так і клерыкальныя каштоўнасці.

**ГІСТАРЫЧНЫ СЕКТАР**

# DEPECHE MODE ПА-БЕЛАРУСКУ

НУ ВОСЬ І ДАЧАКАЛІСЯ! ПАБАЧЫЎ СВЕТ АЛЬБОМ «DEPECHE MODE ПА-БЕЛАРУСКУ». НАРЭШЦЕ ФАНАТЫ «DM» ЗМОГУЦЬ ПАЧУЦЬ СВАЕ ЛЮБІМЫЯ КАМПАЗІЦЫІ Ў ПЕРАКЛАДЗЕ НА БЕЛАРУСКУЮ І РАСЕЙСКУЮ МОВЫ. ПАЧУЦЬ, АЦАНІЦЬ І, ГАЛОЎНАЕ, АДКАЗАЦЬ НА ПЫТАННЕ: «ЦІ ПАТРЭБНА БЕЛАРУСКАМУ СЛУХАЧУ ВЕДАЦЬ ТОЕ, ПРА ШТО СПЯВАЕ ІХ КУМІР?»

Для ўдзелу ў праекце было выбрана 16 музычных калектываў. Аднак у самім альбоме іх прадстаўлена на адзін менш - нейкая затрымка адбылася з гуртом «Крама», іх запіс быў падрыхтаваны пасля таго, як матэрыял усяго альбому быў праслуханы ды станоўча адзначаны лідэрам «DM» Мартынам Горам. Дарэчы, Мартын асабіста курыраваў гэты праект і, нават, знаёміўся з тэкстамі перакладаў песень на беларускую і расейскую мовы. На якой мове спяваць - кожны з удзельнікаў вырашаў для сябе сам.




Большасць песень была запісана Сярожам «Шлёмай» Лабандзіеўскім на Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі. Мэта, пастаўленая перад музыкамі, была адначасова простай і складанай для рэалізацыі: трэба было захаваць стылістыку, ці нават хучэй «дух» музыкі «DM» і пры гэтым не згубіць уласны твар. Адначасова музыкам была прадастаўлена магчымасць для эксперыментаў. У выніку чаго «Нейра Дзюбель», напрыклад, запісаўся з фальклёрным гуртом «Guda», які сканчвае песню «I Feel You» увогуле чыста беларускім фальклёрным матывам. Аляксандр Памідораў уступіў у кантакты з гуртом «Гаер», аднак самае дзіўнае ў тым, што дадзены праект паклікаў да жыцця два найцікавейшых музычных калектыва, якія, здавалася б, назаўжды сайшлі са сцэны. Гутарка ідзе пра калектывы «Flat» і «Калі Юга». Інакш кажучы, гэты альбом зрабіў адразу некалькі каштоўных рэчаў.



Канешне, у розных гуртоў падыход да аранжыроўкі быў свой: нехта пажадаў застацца бліжэй да арыгінала, нехта адыходзіў ад яго на даволі вялікую адлегласць. І цяжка сказаць, хто на самой справе аказаўся ў выйгрышы: большасць і тых, і другіх версій па-сапраўднаму цікавыя, і можна казаць хіба што толькі пра больш ці менш пасяховыя варыянты.

Трэба зрабіць заўвагу, што падобныя альбомы – рэч у музычным свеце не новая і даволі распаўсюджаная. Аднак пры ўсім гэтым такія трэб'юты, як правіла, выпускаюцца ў гонар музыкаў, якія пакінулі гэты свет. Альбом, тоесны да беларускага, пабачыў свет яшчэ ў 1990 годзе. Для Беларусі такая справа зусім новая і з'явіцца на свет магла толькі пры саліднай фінансавай падтрымцы.

І яшчэ раз на развітанне некалькі слоў усё пра тую ж унікальнасць. Не ведаю, ці гэта была ўмова Гора, ці то прадзюсэры выказалі свядомасць, але ж дыск афармлены па-беларуску. І нават ангельскае напісанне нашых прозвішчаў - у беларускай транскрыпцыі. На маю думку, прыклад, варты пераймання.

**P.S.** Паважаныя чытачы, калі Вы жадаеце набыць дыск з кампазіцыямі гурта Depeche Mode у выкананні беларускіх музыкаў, звяртайцеся на адрас рэдакцыі: (0162) 22-90-97.

**Сымон МУЗЫКА**

# "БЕЛЫЙ ЗАМОК 2003" ОТКРОЕТСЯ В КОНЦЕ ФЕВРАЛЯ

28 ФЕВРАЛЯ, 1, 2 МАРТА 2003 ГОДА В МИНСКОМ ДВОРЦЕ ДЕТЕЙ И МОЛОДЕЖИ СОСТОИТСЯ VI ФЕСТИВАЛЬ СРЕДНЕВЕКОВОЙ КУЛЬТУРЫ И МУЗЫКИ "БЕЛЫЙ ЗАМОК". ФЕСТИВАЛЬ "БЕЛЫЙ ЗАМОК" – СТАРЕЙШИЙ ПОСЛЕ ЛЕГЕНДАРНОГО РЫЦАРСКОГО ФЕСТИВАЛЯ В МИРСКОМ ЗАМКЕ – ПРОВОДИТСЯ В МИНСКЕ С 1998 ГОДА. ПОСЕЩЕНИЕ ЭТОГО МЕРОПРИЯТИЯ СТАЛО ДОБРОЙ ТРАДИЦИЕЙ У МНОГИХ РЫЦАРСКИХ КЛУБОВ ИЗ РАЗНЫХ СТРАН.

Три дня будет длиться одно из самых необычных зрелищ в Беларуси.

По количеству участников фестиваль "Белый Замок" не имеет себе равных. В Минск съедутся представители более чем сорока военно-исторических клубов из Беларуси, России, Прибалтики, Украины и Польши. Инициатором и автором идеи фестиваля выступает Орден Северного Храма - одно из старейших рыцарских военно-исторических объединений Беларуси.

Уникальность "Белого Замка" не только в том, что это единственный зимний рыцарский фестиваль, но и в том, что вся турнирная и конкурсная программа проводится в помещении.

Программа фестиваля насыщена мероприятиями, которые наиболее полно передают атмосферу рыцарского турнира, перетекая из одного захватывающего состязания в другое. Поскольку участников с каждым годом становится все больше, в этом году параллельно будет работать несколько площадок. Зрители станут свидетелями турнира лучников, рыцарских сражений на бугуртах, конкурса средневековой моды, конкурса на лучший доспех, показательных боев и других состязаний, а в некоторых из них смогут и поучаствовать. Впервые в Беларуси состоится исторический бал на котором участники смогут изучить и исполнить ряд средневековых танцев. Лучшие представители рыцарских клубов смогут попытать счастья в рыцарском турнире – благородном развлечении для настоящих мужчин или принять бой в составе одной из партий рыцарского сражения – бугурта.

Только на "Белом Замке" турнир и бугурт проводятся по средневековым канонам и реальным правилам XIII века. Одной из ярких отличительных черт фестиваля является его музыкальная часть. Выступления музыкантов сопровождаются средневековыми танцами и другими номерами, которые готовятся совместно с представителями рыцарских клубов.



Также в процессе работы "Белого Замка" будет функционировать средневековая лавка, где можно будет приобрести и обменять самые разные изделия феодальной эпохи, приобрести записи со средневековой и романтической музыкой, видеофильмы о фестивалях, проводимых в Беларуси и за ее пределами и многое другое.

**Максим СЕЛЯГИН**

## МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ

# ЕВГЕНИЙ ОНИЩУК

**ПОКОЛЕНИЕ.**

Слепая ненависть разбила душу,
Прыжок в ничто и лёд стены,
Безжизненный удар, кому же хуже?
Лишь новый поворот судьбы.

Так шаг за шагом кончится свобода,
И от судьбы не убежать сейчас,
Ползти осталось по стене холодной,
И смертью заклинать свой каждый час.

Разбившиеся в кровь колени,
Ещё чуть-чуть и будет наш восход,
Но пятна грязи на кровавом небе,
Звериный крик - таков уж наш итог.

Три цифры шесть расплылись над закатом,
Кровавым ясным заревом пятна,
Безумный мир красивым был когда-то,
И адом стал он в наши времена.

Убитой птицей пролетело время,
Теперь уже не стоит нам на бога уповать,
Единою дорогой будет всем могила,
И мёртвый крест мы будем целовать.

Когда-то ад и рай - всё было нам запретом,
Но ненависть людей разбила времена,
Огонь и сталь - вот властелин планеты,
И боль сердца пронзила навсегда.

Голодная земля поглотила души,
И чёрная звезда печатью будет нам,
Но мы стремились сделать лучше
Презренный мир, убитый навсегда.

# ВЯЗЬМО НА ШЫІ ЦІ ВЫТАНЧАНАСЦЬ ГУСТУ?

ВОСЬ І НАДЫШЛІ СТУДЗЕНЬСКІЯ СВЯТЫ: НОВЫ ГОД, РАСТВО, І РАЗАМ З ІМІ Ў ДЗВЕРЫ ЗАЗІРНУЛА СЕСІЯ. НАДЫШЛА САМАЯ СКЛАДАНАЯ ПАРА Ў СТУДЭНЦКІМ ЖЫЦЦІ. КАБ ПРЫСТОЙНА ВЫГЛЯДАЦЬ ПЕРАД ВЫКЛАДЧЫКАМІ (СУСТРАКАЮЦЬ-ЖА ПА АДЗЕННІ), ШМАТ ХТО СА СТУДЭНТАЎ (ПЕРАВАЖНА МУЖЧЫНСКАГА ПОЛУ) АПРАНУЎ ТАКУЮ РЭЧ, ЯК СТРОЙ. І Ў ДАПАЎНЕННЕ ДА ЯГО – ГАЛЬШТУК. ШКАДА ТОЛЬКІ, ШТО ЧАСАМ НАДАЕЦЦА НАЗІРАЦЬ, ЯК АДЗІН З ЭЛЕМЕНТАЎ РЫМСКАЙ ВОПРАТКІ ПЕРАТВАРАЕЦЦА Ў НЕЙКІ ШНУРОК З ВУЗЕЛЬЧЫКАМ ЛЯ ШЫІ. КАБ У ДАЛЕЙШЫМ ПАЗБЕГНУЦЬ ТАКІХ НЕДАРЭЧНАСЦЯЎ, РАЮ ДАКЛАДНА ПРАЧЫТАЦЬ НІЖЭЙ НАПІСАНАЕ.

## ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ ГАЛЬШТУКА

Гальштук з'явіўся ў Еўропе ў Старажытным Рыме. Легіянеры павязвалі яго для ўцяплення. Таксама шыйныя хусткі выкарыстоўваліся ў Старажытным Кітаі. Пасля распаду Рымскай імперыі сярэднявечныя плямёны сучаснай Румыніі атрымалі ў спадчыну разам з назвай і мовай Рыма і традыцыі, адна з іх – шыйныя хусткі. Ад іх мода на шэйныя хусткі перайшла ў Краатыю (сучасная Харватыя), чый ударны полк падчас святкавання перамогі над туркамі, прыехаў у Парыж. Новая плынь у модзе надта спадабалася каралю. З прыбыўшых карватаў быў створаны гвардзейскі полк, знакам адрознення якога былі каляровыя шыйныя хусткі.

## МІРНАЯ ГІСТОРЫЯ ГАЛЬШТУКА

Пачалася яна з ваеннай перамогі французаў над англічанамі пад Стэнкірхэ ў 1692 годзе. Гэтая вікторыя выклікала фурор у Парыжы. "Мужчыны тады насілі карункавыя гальштукі, якія было цяжка павязаць. Вої перад бітвай паспешна апрануліся і павязалі гальштукі абыякава. Жанчыны знялі з іх прыклады для сваіх убораў" (Вальтэр, "Гісторыя ўладарання Людовіка XIV і Людовіка XV, каралёў французскіх"). Тады гальштукі насілі і мужчыны, і жанчыны.

Аднак з цягам часу гальштук стаў атрыбутам мужчынскага строю. Капіталізм прынес свае змены. Мужчынскі строй перастаў адрозніваццa вычурнасцю, стаў больш строгі. І гальштук стаў амаль адзіным элементам мужчынскага строю, праз які можна было выказаць сваю індывідуальнасць і стыль. 70-я гады XIX ст. – час з'яўлення першых гатовых гальштукаў. Гэта гальштукі-самавязы, якія завязваюцца пры дапамозе вузла, і пластроны – шырокія гальштукі са складкамі.

Напрыканцы XIX ст. у моду ўваходзяць зажымы для гальштукаў. XX стагоддзе – стагоддзе папярочнага гальштука. Да пачатку XX ст. дамінуючую ролю адыгрывалі прадольныя гальштукі. Папярочныя гальштукі (тыя, якімі мы карыстаемся зараз) лічыліся прызнакам артыстычнай натуры. Аднак яны ўвайшлі ў моду пасля поспеху п'есы "Мадам Батэрфляй", калі першы рэжысёр запатрабаваў ад акцёраў надзець на прэм'еру ў Лондане папярочныя гальштукі. З тых часоў яны сталі стандартам мужчынскага адзення.

## ПРАТТ

Быў вынайдзены ў 1985г. і названы так па імені свайго аўтара. Вузельчык даволі аб'ёмны, выпінаецца ўперад, знізу вузкі. Гальштук ў месцы выхада мае авальны выступ уперад.




1. Прапусціце шырокі канец пад вузкім.
2. Перахапіце шырокі канец спераду ўверх, у гарлавіну вузла.
3.Затым апусціце і выцягніце з другога боку ззаду вузла.
4. Працягніце з вонкавага боку злева направа.
5. Працягніце праз вязьмо.
6. Працягніце праз вонкавы бок вузел уніз і зацягніце.

## ВІНЗАР

Шырокі трохкутны вузел, для шырока разыходзячыхся каўнераў. Вынаходніцтва гэтага вузла прыпісваецца герцагу Вінзорскаму, які адмовіўся ад трона дзеля таго, каб ажаніцца на разведзенай амерыканцы.

"А" – шырокі канец, "В" – вузкі.

1. Перахапіце "А" над "В" так, каб "А" быў даўжэйшы за "В".
2. Прапусціце "А" ў пятлю паміж каўнерам і гальштукам, а затым апусціце.
3. Прапусціце "А" пад "В" і ўлева, затым зноўку назад.
4. Працягніце "А" з вонкавага боку злева направа.
5. Працягніце "А" праз вязьмо.
6. Працягніце "А" праз вонкавы вузел уніз.
7. Абедзьвюма рукамі зацягніце вязьмо да каўнера.




## ЧАЦВЯРНЫ

Доўгі і прамы вузел прызначаны для стандартных каўнераў. Вынайдзены ў Англіі напрыканцы XIX ст. Завязваецца ў чатыры рукі, адкуль і атрымаў сваю назву.

1. Перахапіце "А"над "В", так каб "А" быў даўжэй за "В"




2. Правярніце "А" пад "В".
3. "А"перахоплівае яшчэ раз "В" з вонкавага боку.
4. Працягніце "А" ўверх праз вязьмо вакол шыі.
5. Прытрымліваючы вузел указальным пальцам і не давая яму зацягнуцца, працягніце "А" ўніз праз вязьмо.
6. Адпусціце палец і зацягніце вязьмо, паступова перасоўваючы яго да каўнера і адначасова выцягваючы "В".

**Андрусь ЛЯЎЧУК**

# ШКОЛЬНЫ СЛОЎНІК

СЯБРЫ! ПРАДСТАЎЛЯЕМ ВАШАЙ УВАЗЕ «КАРОТКІ ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК ШКОЛЬНІКА". У ІМ – СЛОВЫ, ВЫРАЗЫ, СТВОРАНЫЯ ВАШЫМІ СЯБРАМІ, АДНАГОДКАМІ, НАСТАЎНІКАМІ. ШЧЫРАЯ ПРАЦА НА ЎРОКАХ, КАРОТКІ ПЕРАДЫХ ЦІ ПРОСТА ВОЛЬНАЯ ЧАСІНА, ГОРА ЦІ РАДАСЦЬ СПРЫЯЛІ НАРАДЖЭННЮ ТРАПНЫХ СЛОЎ І ДАСЦІПНЫХ ВЫРАЗАЎ. ТУТ ПАДАЮЦЦА ТЛУМАЧЭННІ НА АСНОВЕ НАЗВАЎ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ. УВАЖЛІВА ЧЫТАЙЦЕ – І ВЫ ЯШЧЭ ГЛЫБЕЙ АДЧУЕЦЕ ХАРАСТВО БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЗМЯСТОЎНАСЦЬ НАШАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

Школа – "Брама неўміручасці"

Званок на ўрок – "Адвечная песня"

Першы ўрок – "Сон на кургане"

Вучні на ўроку – "Людзі на балоце"

Дарога вучня да дошкі – "На смерць Сцяпана Булата"

Пасля праверкі дамашняга задання – "Пагарэльцы"

Дзеннік вучня – "Чорная быль"

Сшытак вучня – "Запіскі Самсона Самасуя"

Класны кіраўнік – "Зацюканы апостал"

Кабінеты пасля ўрока – "Раскіданае гняздо"

Творчасць вучня на школьнай мэблі - "Гравюры Скарыны"

Адказ выдатніка – "Лебядзіная песня"

Адказ двоечніка – "Безназоўнае"

Выклік у канцы ўрока – «Паляванне на апошняга жураўля»

Думкі вучня падчас урока – «Дажыць да світання»

Выкананне дамашняга задання – «Як Базыль у паходзе канаў»

Пытанне да ўсяго класа – «У палескай глушы»

Тлумачальная запіска – «Пісьмо з-пад шыбеніцы»

Дакладная – «Ліст да Абуховіча»

Асабістая справа – «Мужыцкая праўда»

Буфет, сталоўка – «У краіне райскай птушкі»

Савет прафілактыкі – «Суд у слабадзе»

Бацькоўскі сход – «Ценi забытых продкаў»

Пасля сходу – «Незагойная рана»

Класны кіраўнік у класе – «Подых навальніцы»

Дырэктар у класе – «Знак бяды»

Настаўніцкая – «Вязьмо»

Заўвага настаўніка – «Кепска будзе»

Перапынак – «Трывожнае шчасце»

Стараста класа – «Махальнік Іваноў»

Самастойная работа – «Спалох на загонах»

Кантрольная работа без шпаргалкі – «Босыя на вогнішчы»

Званок на сёмы ўрок – «Рэквіем па кожным чацвёртым»

Сёмы ўрок – «Балада аб чатырох заложніках»

Падрыхтоўка да экзаменаў – «Час чумы»

Экзамен – «Судны дзень»

Экзаменацыйны білет – «Пошукі будучыні»

Экзаменацыйная камісія – «Пінская шляхта»

Вучань на экзамене – «Жаба ў каляіне»

Падказка – «Голас сэрца»

Выпускнік – «Дыпламаваны баран», «Малады дубок»

Атэстат – «Хроніка Быхаўца»

# ЧУДЕСА ПРИРОДЫ

Я ВСЕГДА СЧИТАЛ, ЧТО УМЕНИЕ ПРИРОДЫ СОЗДАВАТЬ КРАСОТУ ВО МНОГОМ ПРЕВОСХОДИТ ЧЕЛОВЕЧЕСКИЕ ВОЗМОЖНОСТИ. ВСПОМНИТЕ ХОТЯ БЫ, КАК БЫЛИ УДИВИТЕЛЬНО УКРАШЕНЫ ДЕРЕВЬЯ ЭТОЙ ЗИМОЙ ПО УТРАМ. НО Я БЫЛ ПОРАЖЁН, УВИДЕВ ФОТОГРАФИИ, МОЕГО ЗНАКОМОГО. НЕЧТО ПОДОБНОЕ Я ВИДЕЛ ТОЛЬКО В ПЕЩЕРАХ, НО ПОД ЗЕМЛЁЙ ПОДОБНЫЕ НАПЛЫВЫ СОЗДАЮТСЯ СОТНЯМИ ЛЕТ. А ЗДЕСЬ – ЗА НЕСКОЛЬКО ДНЕЙ. В ЭТИХ ЛЕДЯНЫХ ЧЕРТОГАХ МОЖНО ТОЛЬКО ПОРАЖАТЬСЯ ИЗОБРЕТАТЕЛЬНОСТИ ПРИРОДЫ, ЭТОЙ ИГРЕ СНЕГА И ВЕТРА, ВОДЫ И МОРОЗА.


1.


2.

***Создаётся впечатление, что Природа играет с нами, показывает, на что она способна, чтобы чуть позже удивить и восхитить ещё больше.***

***Поразительно, но раньше это были просто ветки кустарника, стебли цветов, некая труба, а теперь – это маленькое чудо, которое пропадет с появлением тепла. Именно такими чудесами и фантазиями славится зима. Ведь считают, что весна – самая красивая и живая пора года. Что живая – да, но не красивая. Каждая пора года красива по-своему, по-своему утончена. Но зима славится как раз-таки своей фантазией в неповторимой и восхитительной статичности.***

**Дмитрий ШЕСТАК**

**фото: Руслан ЖДАНОВИЧ**


3.

**На фото:**
**1,2 – растения в ледовом «футляре»**
**3 – водонапорная башня в р-не д. Вычулки**

# СНІД У БЕЛАРУСІ

***СТАТЫСТЫКА***

НА 1 СТУДЗЕНЯ 2003 г. У БЕЛАРУСІ ЗАРЭГІСТРАВАНА 4774 ВЫПАДКАЎ ВІЧ. ПА БЕРАСЦЕЙСКАЙ ВОБЛАСЦІ – 228 ЧАЛАВЕК. У ТЫМ ЛІКУ У ПІНСКУ – 112, БАРАНАВІЧАХ – 33, БЕРАСЦІ – 31 ВІЧ-ІНФІЦІРАВАНЫХ. У ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ – 2991, МЕНСКАЙ – 349, МАГІЛЁЎСКАЙ – 213, ГАРАДЗЕНСКАЙ – 167, ВІЦЕБСКАЙ – 144 ВЫПАДКАЎ ВІЧ.

У Берасцейскай вобласці ўтрымліваецца на ўліку 228 ВІЧ-інфіціраваных.

**Размеркаванне па полу:**
- Мужчын – 157(69%)
- Жанчын – 71(31%)

**Размеркаванне па ўзросту:**
- 14 год – 2(0,8%)
- 15-19 – 18(7,5%)
- 20-24 – 79(34,9%)
- 25-29 – 72(31,4%)
- 30-34 – 43(19%)
- 35-39 – 11(4,8%)
- 40 год і болей – 2(0,8%)

**Размеркаванне па прычынах заражэння:**
- сумеснае ўвядзенне наркотыкаў – 179 (79%)
- гетэрасэксуальны кантакт – 39 (16,8%)
- гомасэксуальны кантакт – 1 (0,4%)
- палавы кантакт з ВІЧ-інфіцыраванным – 7 (3%)
- медыцынскія маніпуляцыі ў ЛПУ – 1(0,4%)
- прычына не вызначана – 1(0,4%)

**Размеркаванне па кантынгентах:**
- працоўныя – 29(12,8%)
- студэнты – 1(0,4%)
- служачыя – 6(2,6%), ў тым ліку 1 педагог
- навучэнцы ПТВ – 4(1,7%)
- асобы з месцаў пазбаўлення волі – 46 (19,9%)
- асобы без пэўнай дзейнасці – 139(61%)

**Размеркаванне па прычынах абследвання:**
- наркаманія – 100(44,2%)
- вензахворванні – 24(10,6%)
- ў месцах пазбаўлення волі – 50(21,6%)
- па клінічным паказаннях – 16(7%)
- па эпідпаказаннях – 12(5,3%)
- іншыя прычыны – 8(3,5%)
- цяжарнасць – 4(6,1%)
- добраахвотна-ананімна – 14(6,1%)

**Падрыхтавала Алена КІРЫЧУК**
**па матэрыялах Цэнтра прафілактыкі СНІД**

***АБ'ЯВЫ***

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці.**
**Тэл. (0162) 22-90-97.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці. Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 22-90-97.**

# КАЖДОМУ ЖИТЕЛЮ – ПО ВЕЛОСИПЕДУ

УВЕЛИЧЕНИЕ ГОРОДСКОГО НАСЕЛЕНИЯ, ЗАГРЯЗНЕНИЕ ВОЗДУХА, ПОВЫШЕНИЕ УРОВНЯ ШУМА – ВСЁ ЭТО ЗАСТАВЛЯЕТ ЛЮДЕЙ ЗАДУМАТЬСЯ О ТОМ, ЧТО ЕСЛИ НЕ НАЧАТЬ АКТИВНЫХ ДЕЙСТВИЙ, ТО В БЛИЖАЙШЕМ БУДУЩЕМ МОГУТ НАЧАТЬСЯ НЕОБРАТИМЫЕ ЭКОЛОГИЧЕСКИЕ ИЗМЕНЕНИЯ.

Как известно, более 50% выбросов $NO_x$ и $CO_2$ вырабатываются двигателями автотранспорта. 20-25% европейцев, живущих в больших городах, жалуются на шум, производимый автотранспортом. Расход энергии в транспортном секторе каждые 20 лет увеличивается вдвое.

В 2000 году 813 городов 30 европейских государств 22 сентября приняли участие в акции «День без автомобилей». Администрации этих городов призвали жителей «вновь открыть для себя родной город», передвигаясь по его улицам пешком, на велосипеде или в общественном транспорте.

Организаторами этого широкомасштабного мероприятия выступили различные экологические организации и Европейская комиссия, которые этой акцией хотели привлечь внимание общественности к проблеме загрязнения воздуха в городах и напомнить о здоровом образе жизни.

«День без автомобилей» не оказал существенного экономического воздействия на производственые компании. В этот день не было зарегистрировано большого числа опозданий на работу или прогулов, а, по утверждению продавцов, число покупателей в магазинах в этот день не только не снизилось, но даже в некоторых случаях возросло.

В Беларуси про такой день знают немногие. Хотя в нашей стране большие города тоже задыхаются от выхлопных газов, а сотни тысяч машин не соответствуют экологическим нормам, велосипеды как альтернатива автомобилям и общественному транспорту не рассматриваются.




Конечно, наши улицы не сравнить с европейскими, где везде есть велосипедные дорожки, специальные светофоры, и возле каждого магазина предусмотрены места для стоянки велосипедов. Но ведь и нам надо когда-то начинать.

Если с каждым годом на улицах в наших городах станет появляться всё больше велосипедистов, то местные власти будут обязаны обеспечить безопасность движения на дорогах. И, возможно, в будущем при выборе средств передвижения люди будут отдавать предпочтение не автомобилям, а именно велосипедам как самому дешёвому и экологически чистому виду транспорта.

**Елена КИРИЧУК**
**по материалам журнала «Зелёные новости»**

АБ'ЯВЫ

# НАВІНЫ АД БМА

Кантактуй з Беларускай музычнай альтэрнатывай! Толькі ў нас пастаянныя святочныя зніжкі! Набудзь пяць дыскаў – шосты атрымаеш задарма!!! Магчыма дастаўка да хаты пакупніка. Прапануем заробак распаўсюднікам у Менску і рэгіёнах.

**Кантактуй з намі:** 8 (0296) 49 08 88, pager: 211 85 85 аб. БМА. 220085, г. Менск, а/с 5 wital@tut.by, www.BMA.home.by.

# ЛАДЗЯЦЦА КУРСЫ КАРЭКТАРАЎ

Газета "Наша Ніва", РГА "Беларускі ПЭН-цэнтр", часопісы "ARCHE", "Беларускі гістарычны агляд", "Дзеяслоў" і BARCNEWS запрашаюць маладых людзей са скончанай і няскончанай філалагічнай адукацыяй на курсы карэктараў. Лекцыі на курсах будуць чытаць вядомыя мовазнаўцы. Па выніках курсаў найлепшым слухачам будзе прапанаваная праца ў беларускіх выданнях і выдавецтвах. Меркаваны час правядзення курсаў — сакавік 2003 года.

**Кантакты:** Беларускі ПЭН-цэнтр, тэл. (017) 288-14-61, адрас для ліставання: 220050, а/с 218, Менск, e-mail: pen@pen.unibel.by.

# ПРЫЙШОЎ ЧАС ДЗЕЙНІЧАЦЬ!

Павіншуй сваіх знаёмых, сяброў, каханых па-беларуску і канешне ж беларускай песняй! Патрабуйма свайго разам!

**Радыё РОКС.** Штодня з 13.00 да 14.00, з 21.00 да 22.00. Факс: 2882013, 269-09-27. Пошта: 220002, г. Менск, вул. Старажоўская, 8А. E-mail: musicbox@roks.com, radio@roks.com, www.roks.com.

**Сталіца FM.** Штодня з 12.00 да 13.00, з 20.00 да 21.00. Для ліставання: г. Менск, вул. Захарава, 42. Факс: 2365305, 2364351. Эфір: 2100367, 2100373.

**Радыё 1.** Штодня з 20.10 да 21.30. Паштоўка за месяц на адрас: г. Менск, вул. Чырвоная, 4 (праграма "Вітаем! Віншуем! Жадаем!").

**Unistar.** Буднія дні з 12.00 да 13.00. Прамы эфір: 209-55-55. Факс: 209-53-75 (штодня з 10.00), pager: 207-00-00 аб. "Юністар". www.unistar.by

**Dzedzich week-news**

# ЛІТАРАТУРНЫ КОНКУРС АД LEGE ARTIS

Аб'яднанне ў падтрымку развіцця мастацтва "Lege Artis" абвяшчае конкурс на лепшы літаратурны твор на тэму „Адны знаходзяцца ў святле – а іншыя?".

Удзел у конкурсе могуць узяць беларускія аўтары ва ўзросце ад 30 да 40 гадоў.

Памер прэміі складае € 500.

Тэма конкурса прадугледжвае літаратурнае асэнсаванне актуальных пытанняў сучаснасці. На конкурс прымаюцца дакументальныя, паэтычныя і лірычныя, драматычныя тэксты і кароткія апавяданні. На разгляд прымаюцца толькі не публікаваныя раней творы.

Пажадана, каб аб'ём тэкстаў не перавышаў 30 старонак. У выпадку большага аб'ёму просьба прыкласці кароткі выклад альбо фрагмент тэксту. У склад журы ўваходзяць Лейпцыгскія пісьменнікі, паэты, славісты, германісты і крытыкі мастацтва.

Узнагароджанне лаўрэата адбудзецца ў Лейпцыгу ў сакавіку 2004 года і будзе прымеркавана да Лейпцыгскага кніжнага кірмашу. Апошні тэрмін адпраўлення рукапісаў: 1 верасня 2003 г.

Тэксты дасылаць на адрас: „Lege Artis" e. V. Verein zur Kunstfoerderung Adolph-Menzel-Str. 36 04157 Leipzig Германія. Тэл./факс: 8 1049 341 9121004, альбо тэл.: 8 1049 341 9022114.

**Dzedzich week-news**

**Клуб «Дзедзіч» шукае добраахвотніка**

## WEB-ДЫЗАЙНЕРА

**(з сярэднім узроўнем валодання WEB-праграмаваннем), які б дапамагаў нам у абнаўленні і ўдасканаленні сайта арганізацыі: http//:dzedzich.vezha.unibel.by.**

**На жаль, мы не можам аплаціць гэтую працу, але каву, гарбату і добрую сяброўскую атмасферу гарантуем. Тэл.: 22-90-97.**

**У нядзелю, 9 САКАВІКА, у 12[00]**

## ДЗЕНЬ АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ

**у БАМГА ДАК «Дзедзіч».**

**Хочаш пазнаёміцца з нашай дзейнасцю? Даведацца, хто мы такія, што робім, да чаго імкнемся?**

**Прыходзь сам, ці з сябрамі:**

**вул. ЖУРАЎЛІНАЯ, 20 (прып. «Зялёная»).**

*АБ'ЕКТЫЎНА ПРА РЭАЛЬНАЕ*

**RR**

**РАДЫЁ РАЦЫЯ**

***НА КАРОТКІХ ХВАЛЯХ***

*6035 кГц (49 м) 08:00-10:00*
*6180 кГц (49 м) 13:00-15:00*
*6050 кГц (49 м) 21:00-23:00*

***НА СЯРЭДНІХ ХВАЛЯХ***

*612 кГц (490 м) 07:00-11:00*

**WWW.RACYJA.PL**

Берасцейскае абласное аддзяленне
**Грамадскага аб'яднання ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР «ВЯСНА»**

прапануе грамадзянам бясплатную прававую дапамогу.
(адміністратыўнае і грамадзянскае права, парушэнні правоў чалавека)

**Звяртайцеся на адрас:** г. Берасце, бульвар Шаўчэнкі, д. 7, кв. 24. Тэл./факс: (0162) 20-13-95.

## БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІЧКА ЗАПРАШАЕ

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**

Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.

**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

## ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв.2.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго:

## УВАГА!

Працягваецца бясплатная падпіска

**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч" для асоб, што не жывуць у г. Берасці.**

Калі ты жадаеш атрымоўваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:

**224000, г.Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв. 2.**

Чаму ты вырашыў падпісацца:

Проз[redacted]

Імя: [redacted]

Імя п[redacted]

Пашт[redacted]

[redacted]

*Ты пакінь мяне, нуда мая нямая! (М. Багдановіч)*




ШАНОЎНАЕ СПАДАРСТВА! КАБ НА ЛЕКЦЫЯХ ДЫ ЗАНЯТКАХ ВАМ БЫЛО НЕ ТАК СУМНА, ДЫ КАБ НЕ АТРАФІРАВАЛІСЯ МАЛЕНЬКІЯ ШЭРЫЯ КЛЕТАЧКІ, МЫ ПРЫГАТАВАЛІ ДЛЯ ВАС НЕВЯЛІЧКІ СКАНВОРД. АДРАЗУ ХАЧУ АБМОВІЦЦА – СПРАВА ДЛЯ НАС НОВАЯ І ВОПЫТУ МАЛАВАТА, АЛЕ, МАЕМ СПАДЗЯВАННЕ, ШТО З ЦЯГАМ ЧАСУ І ВОПЫТ І ЗДОЛЬНАСЦІ ПРЫЙДУЦЬ САМІ САБОЮ. НУ, А КАЛІ НЕХТА СКАЖА, ШТО СКАНВОРД БЛАГІ АБО ЗУСІМ НЕ ЦІКАВЫ - Я ПРАПАНУЮ СКЛАСЦІ НЕШТА ПАДОБНАЕ САМОМУ. ТАКІМ ЧЫНАМ, ДАЗВОЛЬЦЕ АБ"ЯВІЦЬ КОНКУРС НА ЛЕПШЫ БЕЛАРУСКІ СКАНВОРД. СВАЕ ТВОРЫ, А ТАКСАМА ПРАПАНОВЫ І ЗАЎВАГІ ДАСЫЛАЙЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ З ПАМЕТКАЙ НА КАНВЕРЦЕ: «БЕЛАРУСКІ СКАНВОРД». ЖАДАЮ ПОСПЕХАЎ!

**Андрусь ЛЯЎЧУК**

## ДАРЭЧЫ

Вайна. Вайсковы перакладчык вядзе допыт ваеннапалоннага:

- Уот із ёр нэйм?
- My name is John Smith.

... ХРАСЬ палоннаму па рожы...

- Уот із ёр нэйм?
- [здзіўлена]

My name is John Smith!

... ХРАСЬ! Палоннаму па рожы...

- Уот из ёр нэйм?!
- [ледзь не плачучы]: My name is John Smith!!!

... ХРАСЬ!!! Палоннаму па рожы...

- Я цябе, гад, пытаю - колькі ў цябе танкаў!!!???

***

Які боль, які боль,Арбакайтэ без майкі - 0:0!

***

- Хачу завесці сабаку, жонка не дае...
- А чаму ж ты вырашыў, што сабака дасць?

***

Прыехалі ў армію навабранцы. Іх вядзе камузвода па палігоне, дзе скачуць з парашутам, і гаворыць:

- Глядзіце, вось там самалёт коламі лятае?

Тыя рты раззявілі:

- Так, так!
- А вунь, бачыце, група скокнула. Ляцяць, ляцяць, вось парашуты расчынілі на вышыні 1000 метраў, ляцяць, ляцяць, вось упалі, пабеглі. Гэта вайскоўцы па паўгады адслужылі, і вы такія ж будзеце. А вунь, глядзіце, з таго ж самалёта другая група скокнула. Ляцяць, ляцяць, вунь парашуты расчынілі на вышыні 500 метраў, ляцяць, ляцяць, упалі, пабеглі. Гэта нашыя вайскоўцы, яны год адслужылі, і вы такімі ж праз год будзеце.

Тыя яшчэ больш рты разявілі:

- О-о-о-а-а!!!
- А вось глядзіце з самалёта трэцяя група скокнула, ляцяць, ляцяць..., ляцяць, ляцяць..., упалі і пабеглі! Бачылі?
- Так!
- Дык гэта нашыя дзембеля пантуюцца!

***

Маленькая дзяўчынка гадоў шасці цягне дзве вельмі вялікія торбы да прыпынку. На прыпынку ёй дапамагаюць занесці іх у аўтобус.

На наступным прыпынку дзяўчо выходзіць і збіраецца ісці, як раптам чуе голас вадзіцеля:

- Дзяўчынка, а торбы?

Дзяўчо падымее правую руку і паварочаецца тварам да аўтобуса:

- АЛЛАХ АКБАР!!!

№ 1 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
люты 2003
ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 17.02.2003 у $18^{00}$
**Наклад:** 299 асобнікаў.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Дземідзюк, Д. Дзянісаў, Д. Шастак, М. Есіна, А.Верамчук, У. Чаберкус
**Адказны сакратар:** М. Сялягін. **Вёрстка:** А. Ляўчук

**Кантактны тэлефон:** (0162) 22-90-97
**E-mail:** dzedzich@mail.ru